ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок пошп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідкі. Зьмыт тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Органа Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СУБОТА, 26 ліпеня 1930 г.
№ 172 (3770)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Так ня выконваюць заданьняў партыі

Будаўніцтва фабрык мяса—пад пагрозай

Абавязкова трэба:

Ударным тэмпам укамплектаваць калгасы і саўгасы сьвінаматкамі
Выканаць усе будаўнічыя пляны
Падрыхтаваць кадры і варыць магутную кармавую базу

Хопіць разважаньняў

Нядаўна мы апублікавалі на старонках «Зьвязды» дакумант вялікай палітычнай важнасьці—ліст Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б на пытаньнях сьвінаводзтва.

ЦК, падкрэсьліваючы гаспадарча-палітычнае значэньне сьвінаводзтва, як найкарацейшага шляху да вырашэньня [illegible]ной праблемы, з усёй **катэгарычнасьцю завастрыў увагу на невыстарчальных тэмпах будаўніцтва фабрык мяса.**

Па пытаньнях сьвінаводзтва партыя і ўрад далі зусім выразныя і баявыя заданьні. Адпаведныя арганізацыі (Наркамзем, калгаспа-каапэрацыйная сыстэма і г. д.) пры ўдзеле грамадзкасьці павінны былі неадкладна ўзяцца за ажыцьцяўленьне гэтых важнейшых заданьняў.

Трэба з усёй рашучасьцю адзначыць, што ў разьвіцьці сьвінаводзтва яшчэ **няма** ўдарных тэмпаў. Наркамзем, калгаспа-каапэрацыйныя органы, прафсаюзы, камсамол яшчэ **не зварачаюць** на сьвінаводзтва патрэбнае ўвагі.

«... Работа ў спэцыялізаваных сьвінаводных саўгасах і калгасах не разгорнута. Амаль што нічога ня робіцца па ўкамплектаваньні матачным матар'ялам і па стварэньні кармавой базы. Не ва ўсіх саўгасах і калгасах пачата будаўніцтва і зусім ня прыцягнута грамадзкасьць бядняцка-сераднякіх мас вёскі і нават саміх рабочых саўгасаў і калгасьнікаў да мерапрыемстваў па разьвіцьці сьвінаводзтва». (З ліста ЦК КП(б)Б.

На мясцох асобныя арганізацыі недапушчальна адносяцца да сьвінаводзтва, ігнаруючы ўсе дырэктывы партыі і ўраду па гэтым пытаньні. Мы ня раз у «Зьвязьдзе» падавалі факты абураючых адносін некаторых раённых выканкомаў і райкалгассаюзаў да справы сьвінаводзтва. У **Камарынскім** раёне, напрыклад, мясцовыя арганізацыі доўгі час вялі паміж сабой спрэчкі, хто павінен адказваць за сьвінаводзтва. Тым часам у калгасах зрываліся будаўніцтва сьвінарнікаў і ўкамплектаваньне сьвінаматачным матар'ялам, у раёне кантрактацыя сьвінаматак праходзіла недапушчальна дрэнна і г. д.

Матар'ялы, зьмешчаныя ў сёньняшнім нумары «Зьвязды», яшчэ раз сьцьвярджаюць, што на мясцох будаўніцтва сьвінарнікаў знаходзіцца пад пагрозай зрыву. У большасьці раёнаў няма бесьперабойнага ўкамплектаваньня сьвінаводных калгасаў і саўгасаў, нічога ня робіцца па падрыхтоўцы кадраў, па стварэньні кармавой базы і г. д. У **Лёзьнянскім** раёне да сёньняшняга дня паваг не скарыстаны крэдыты, адпушчаныя на будаўніцтва сьвінаводных калгасаў. Вылучэньне калгасаў пад сьвінаводныя гаспадаркі таксама ня скончана. У гэтым пытаньні панує блытаніна, хаос. Ня лепш стаіць справа з будаўніцтвам сьвінаводных калгасаў і ў **Жлобінскім** раёне. Раённыя арганізацыі, як паведамляе наш брыгадзір, у пытаньнях сьвінаводзтва ўзялі стаўку на самацёк. Яны нічога ня ведаюць, як ідзе будаўніцтва сьвінаводных калгасаў, супакойваючы сябе беспадстаўнымі заявамі, быццам «усё добра, усё ў парадку».

Чаго варта такая пастаноўка работы? Хіба гэта не зьяўляецца бюракратычным ігнараваньнем заданьняў партыі і ўраду па разьвіцьці сьвінагадоўлі? Хіба такія адносіны да сьвінаводзтва спрыяюць вырашэньню [illegible]ной праблемы? Не, ні ў якім выпадку. Усякае ігнараваньне сьвінаводзтва, усякі зрыў плянаў будаўніцтва сьвінаводных калгасаў і саўгасаў, усякая маруднасьць і бязьлітаснасьць па гэтым адказнейшым вучастку толькі на руку кулаку, які цяпер прабуе дэзарганізаваць фронт жывёлаводзтва.

Мы павінны абвясьціць самую бязьлітасную барацьбу бюракратычным скрыўленьням, бездакназнасьці, нядбайнасьці і самацёку ў практычнай рабоце па разьвіцьці сьвінаводзтва. Трэба з усёй рашучасьцю і жорсткасьцю ўдарыць па тых, хто ігнаруе і зрывае асноўныя гаспадарча-палітычныя заданьні партыі.

Трэба раз на заўсёды скончыць бясконцыя бюракратычныя спрэчкі паміж Сьвінаводтрэстам, Белмясам, Белсельтрэстам, што толькі перашкаджае разьвіцьцю сьвінаводзтва. Зусім недапушчальна, калі такая арганізацыя, як Наркамзем, лічыць сьвінаводзтва другараднай справай, паўна заяўляючы, што «мы тут ня пры чым». Як раз Белкаапсаюз можа і павінен адыграць значную ролю ў разьвіцьці сьвінаводзтва. Укамплектаваньне нашых сьвінаводных калгасаў і саўгасаў сьвінаматачным матар'ялам, як мы ўжо адзначалі вышэй, праходзіць нездавальняюча. Між тым шмат пізавых каапэрацыйных арганізацый (**Негарэльская, Заслаўская** і г. д.) затрымліваюць дзесяткі сьвінаматак і не перадаюць іх у калгасы і саўгасы.

У вельмі **нездавальняючым** становішчы знаходзіцца **падрыхтоўка кадраў** для сьвінаводных калгасаў і саўгасаў. Саюзны Наркамзем і Наркампрацы СССР пастанавілі мабілізаваць у распараджэньне беларускай канторы «Сьвінаводу» 36 вэтдактароў і 10 фэльчароў. Гэта важнейшая пастанова павісла ў паветры. Павісла ў паветры таксама і пастанова НКЗ БССР аб тэрміновай мабілізацыі 20 агранамаў-арганізатараў і 15 зоатэхнікаў.

Віцебскі вэтарынарны інстытут індаўна прыслаў у «Сьвінавод» сьпіс 20 вэтдактароў, якія накіроўваліся ў яго распараджэньне. Калі-ж пытаньне паўстала канкрэтна аб дактарох, дык аказалася, што пазавіна паказаных у сьпісе асоб разьехалася па ўсім СССР. Трэба нарэшце пакласьці канец гэтым безадказным адносінам да кардынальнейшай задачы падрыхтоўкі кадраў. Інакш кантрольныя лічбы сьвінаводзтва ня будуць выкананы.

Нельга прайсьці моўчкі міма тых агідных і вялікіх прарываў, якія ёсьць у рабоце **Белкалгасбуду.** Фактам зьяўляецца тое, што Белкалгасбуд па сёньняшні дзень вялеў пачаць будаўнічыя работы толькі ў 22 саўгасах.

Паранейшаму няма **ніякага** зруху ў разгортваньні работы па разьвіцьці сьвінагадоўлі ў індывідуальным сэктары, індывідуальны сэктар вышэй з пляну і мерказваньняў мясцовых і адпаведных цэнтральных арганізацый. На гэты вучастак трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

Баявыя пляны будаўніцтва фабрык мяса павінны быць выкананы абавязкова.

Новы ураджай

На здымку капы жыта ў калгасе «Расьсьвет—Пераможца»

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва—рашаючыя праблемы будаўніцтва

Узьнімаючы і мабілізуючы мільённыя масы на ажыцьцяўленьне пяцігадовага гаспадарчага плану, партыя накіравала верны і рашаючы шлях пасьпяховага выкананьня гэтых задач праз сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва, паўстаўшае па ініцыятыве рабочых, **не знайшло падтрыманьня ў старога апартуністычнага кіраўніцтва УсеЦСПС.** Перадавыя атрады рабочае класы **праз голаву сваіх апартуністычных правадыроў, пад кіраўніцтвам партыі,** уступілі ў сьмяротны бай са спадчынным апартунізмам: расхлябанасьцю, недысцыплінаванасьцю і рваццкімі тэндэнцыямі асобных праслоек рабочых на прадпрыемствах, за новыя сацыялістычныя адносіны да працы і да вытворчасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцкі рух — рашуча падтрыманыя партыяй і новым кіраўніцтвам УсеЦСПС абгрунтаваліся цяпер у гіганцкі рух рабочае класы і працоўных мас вёскі. Яно дапамагло і дапамагае павярнуць прафсаюзы і масы тварам да вытворчасьці, выкарчоўваць апартунізм і дзяляцтва ў прафсаюзнай рабоце. Спаборніцтва робіць асноўны пераварот у поглядах людзей на працу і ператварае гэту працу «з ганебнага і ненавіснага цяжару, якім яна лічылася раней, у справу **гонару,** у справу **славы,** у справу **гэройства**» (Сталін).

Сацыялістычнае спаборніцтва пры падтрыманьні перадавых пралетараў пракінулася з вёскі — у саўгасы і калгасы. На тых вясковых вучастках, дзе спаборніцтва і ўдарніцтва праходзіць пад непаслабным кіраўніцтвам з боку партыйных арганізацый і працяльнага саўгасаў і калгасаў, **яно сядзейнічае і паспарае ўцягненьне мас у калгасная будаўніцтва і дапамагае з посьпехам выкарчоўваць рэшткі капіталізму ў вёсцы.**

Аднак, побач з гэтымі вялізарнымі дасягненьнямі ёсьць нямала недахопаў, а часта і ўпоўх памылак. Самаправерка сацыялістычнага спаборніцтва выявіла нямала нездаровых зьяваў. У працэсе самаправеркі выявілася, што далёка яшчэ ня ўсе рабочыя і работніцы ўцягнуты ў спаборніцтва. Брыгады, якія абяжяжоўваюцца, сьцяною замкнутасьці ад мас, не растуць колькасна і пагаршаюцца якасна. Ня зьнішчана яшчэ канчаткова старая хвароба спаборніцтва, калі ў пагоні за высокімі нормамі выпрацоўкі асобныя ударнікі забываюць **другую важнейшую задачу — рашуча змагацца за якасьць прадукцыі.** У пагоні **за паказальным спаборніцтвам** асобныя арганізацыі наўмысьля **перапавялічваюць лічбы сапраўднага ахопу рабочых спаборніцтвам і ўдарніцтвам.**

Усё яшчэ застаецца вельмі слабым месцам вучот работы ўдарнікаў і заахвочваньне іх з боку гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый. Далёка невыстарчальны **таксама ўдзел камуністых і камсамольцаў ва ўдарным руху.**

Пагалоўнае ўцягненьне ў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ўсіх камуністых і камсамольцаў павінна стаць этапам да пагалоўнага ўцягненьня ўсіх рабочых. Кожная партыйная, прафсаюзная і гаспадарчая арганізацыя, кожны партыец, камсамолец і беспартыйны ўдарнік павінны паставіць перад сабой баявую задачу **ў самы кароткі тэрмін ўцягнуць па ўдарны рух пагалоўна ўсіх рабочых і спэцыялістых на сваіх прадпрыемствах.**

Пастаянная і непаслабная сувязь з ударнікамі, рэгулярнае інструктаваньне іх, пагалоўнае ўцягненьне ўдарнікаў у работу вытворчых нарад папулярызацыя і заахвочваньне лепшых з іх у другу і на сходах рабочых, правільны вучот работы ўдарных брыгад, рашучы паход за ліквідацыю **пісьменнасьці** сярод адсталых мас і пароўнце **шырокае разгортваньне крытыкі і самакрытыкі** работы кіруючых арганізацый і саміх ударнікаў вырашаць пытаньне аб уцягненьні найшырэйшых мас ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Шырокае ўжываньне ў практыцы сацыялістычнага спаборніцтва новых рацыяльных форм — «грамадзкага буксіру» і «складных брыгад» — павінна зьвяцца таксама **магутным сродкам уцягненьня новых пластоў рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва.** У падыходзячыя ўборачную і хлебазагатоўчую кампаніі рабочыя павінны дацямачы саўгасам і калгасам правесьці гэтыя кампаніі пад знакам сацыялістычнага спаборніцтва. («ПРАВДА»).

Забясьпечыць ленінградзкіх рабочых бульбаю

Белагародніна і Белкаапсаюз ня выконваюць нарадаў

Рэдакцыя газэты атрымала тэлеграму за подпісам намесьніка старшыні Саюзплодагародніны т. Бязьдзецкага наступнага зьместу:

«Нарады на адгрузку раньняй бульбы ня выконваюцца. Задавальняецца другараднае мясцовае забясьпячэньне. Прапаную Белплодагароднае неадкладна прыступіць да выкананьня даных нарадаў. Прашу пракурора прыцягнуць да адказнасьці асоб, вінаватых у зрыве забясьпячэньня. Рэдакцыю газэты прашу асьвятліць гэта пытаньне на сваіх старонках».

Учора наркамгандлю БССР тав. **БАЛЦІН** пры ўдзеле нашага супрацоўніка правёў нараду па пытаньні забясьпячэньня мясцовага рынку гароднінай і адгрузкі яе ў Ленінград і Маскву.

Як высьветлілася, забясьпячэньне мясцовых патрэб ідзе здавальняюча. Значна горш стаіць справа з вывазам раньняй бульбы ў Ленінград. Саюзплодагароднінай у чэрвені месяцы быў даны нарад у 300 тон бульбы, які Белплодагароднінаў поўнасьцю выканала. Гэты нарад быў Белплодагароднінай разьмерзваны паміж Папяводсаюзам, Садсаюзам і Белкаапсаюзам. Папяводсаюз і Садсаюз вызначаныя для іх нормы адгрузкі выканалі, а Белкаапсаюз, які павінен быў адгрузіць усяго 50 тон не адгрузіў ні аднаго кілёграму.

У ліпені быў атрыманы нарад на адгрузку ў Ленінградзкую вобласьць 1.526 тон раньняй бульбы. На сёньняшні дзень Белплодагароднінаў ня мае ніякіх вестак аб тым, як праходзіць адгрузка гатай бульбы і яе загатоўка на мясцовым рынку.

Нарадай ухвалены рад пастаноў для паляпшэньня і рэгуляваньня забясьпячэньня і вывазу раньняе бульбы і іншай гароднины. Кожныя 5 дзён Белплодагароднінаў павінна атрымліваць тэлеграфныя весткі аб ходзе загатовак і адгрузкі. Белплодагароднінае запрапанавала ўстанавіць чаргу адгрузак на вывоз і для ўнутранога забясьпячэньня. Бульба ў Ленінград павінна адгружацца ў першую чаргу, прычым бяз страт для ўнутранога забясьпячэньня.

Адзначаючы надзвычай слабое выкананьне загатовак, асабліва агіднае выкананьне сувязі, Наркамгандаль запрапанаваў Белкаапсаюзу, с.-г. каапэрацыі і Белплодагароднінаў у бліжэйшыя два дні дабіцца рашучага пералому ў гэтай справе. Сыстэме спажывецкай і сельскагаспадарчай каапэрацыі павінны быць разасланы адпаведныя інструкцыі. На месцы разасланы адказныя работнікі для паляпшэньня загатовак і вывазу. Асобы, якія зрываюць вывяз раньняй бульбы ў Ленінград, павінны прыцягвацца да суровай адказнасьці.

Старшыні Белплодагароднінаў т. Гейнэ запрапанавана мець узмоцнены нагляд за выкананьнем гэтае пастановы.

Усе загатоўчыя арганізацыі павінны ўжыць усе меры для поўнага забясьпячэньня выкананьня пляну загатовак і вывазу, накіроўваючы ўсе справы аб зрыве завозу і загатовак пракурору і Наркамгандлю для прыцягненьня да адказнасьці.

Трэба лічыць, што ў бліжэйшыя дні плян забясьпячэньня Ленінграду патрэбнай бульбай будзе выкананы.

Забастовачны рух у фашысцкай Польшчы

Кожны дзень прыносіць нам новыя праявы пагаршэньня эканамічнага крызісу ў фашысцкай Польшчы, а разам з тым пагаршэньне крызісу і фашысцкай дыктатуры. З гэтага крызісу фашызм шукае выхаду ва ўзмацненьні эксплёатацыі рабочых мас, у прасьледаваньні рэвалюцыйнага руху, ва ўзмацненьні падрыхтоўкі ваеннага нападу на СССР.

У апошнія тыдні капіталісты пры энэргічным падтрыманьні фашысцкага ўраду пачалі энэргічнае наступленьне на зарплату на абшары амаль усёй Польшчы. Напрыклад у Пазнанскім і Паморскім ваяводзтвах плата ўжо зьніжана на 10 проц., а ў Радомскім—на 10-25 проц. Зараз прамысловцы зьвярнуліся да ўраду з мэмарандумам аб выданьні закону, які-б караў турмой за арганізацыю забастовак.

Адначасова з гэтым павялічваецца і рабочы дзень. У Лодзі ўжо ўведзены 10-12 гадзінны рабочы дзень. Праводзіцца далейшая рацыяналізацыя, якая праяўляецца ў ліквідацыі дробных прадпрыемстваў, або ў аб'яднаньні іх у большыя, ліквідуецца дапамога ім і г. д.

На атаку капіталу пралетарыят адказвае контр-наступленьнем. За апошні час ва ўсім краю значна ўзмоцніўся забастовачны рух, рабочыя выходзяць на вуліцу з дэманстрацыямі пратэсту, праводзяцца масавыя рабочыя сходы, на якіх выбіраюцца забастовачныя камітэты і г. д. На працягу апошніх [illegible] у адным толькі Варшаве [illegible] радзе фабрык і заводаў адбылося некалькі забастовак (заводы «Шкода», Дабравольскага, Норбліна і г. д.). На фабрыцы Норбліна звольненыя рабочыя імкнуліся прабрацца ўнутр фабрыкі прычым выкліканых на фабрыку паліцэйскіх рабочыя закідалі каменьнямі. У прыгарадах Варшавы забастоўкі адбыліся ў радзе цагельняў, на некаторых гутах і забастоўкі пекароў.

У Лодзі на фабрыцы Гампе-Альбрэхт выбухнула забастоўка - пратэсту супроць павялічэньня рабочага дня. Дзякуючы энэргічнаму адпору рабочых фабрыканты павінны былі адмяніць распараджэньне. Адбыўся рад забастовак таксама і на бавоўняных фабрыках.

Апрача Варшавы, Лодзі, Дамброўскага вугальнага раёну забастоўкі адбыліся яшчэ на драбнейшых прадпрыемствах у Пазнанскім і Радомскім ваяводзтвах. У Дамброўскім вугальным раёне на 4 гутах абраны чатыры камітэты дзеяньня.

Так адказваюць рабочыя на наступленьне капіталу, на тэрор фашызму і яго паслугачоў — сацыял-фашыстых.

Высылка Вальдэмараса з Коўні

КОЎНЯ, 25. Як падае агенцтва Эльта, камэндант Коўні пастанавіў выслаць былога прэм'ера Вальдэмараса з Коўні, як асобу небясьпечную для грамадзкага спакою і парадку. Учора пастанова камэнданта была выканана. (ТАСС).

Разьменнай манэты ў нас хапае

САПРАЎДНЫМ ВІНОЎНІКАМ ЗАТРУДНЕНЬНЯЎ З РАЗЬМЕНАМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НАШ КЛЯСАВЫ ВОРАГ

Неабходна з усёй строгасьцю рэвалюцыйнай законнасьці ўдарыць па спэкулянтах

(ГУТАРКА З т. БРУХАНАВЫМ)

МАСКВА, 24. За апошні час у Маскве і ў іншых гарадох Саюзу заўважваецца недахват разьменнай манэты. З гэтага поваду прадстаўнік органаў цэнтральнага друк зьвярнуўся ў Наркамфін СССР да **т. Бруханава** з запытаньнем аб прычынах недахвату манэты і аб мерах ліквідацыі гэтага зьявішча.

Тав. Бруханаў сказаў:

Контр-рэвалюцыянэры і шкодзікі ўсіх колераў накіроўваюць усе намаганьні, каб перашкодзіць разгортуту ходу сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтых мэтах усяк выкарыстоўваюцца для контр-рэвалюцыйнай агітацыі ўсе часовыя затрудненьні, якія няўхільны на пазасобных вучастках у эпоху, калі рабочая кляса вядзе напружанае будаўніцтва, укладаючы аграмадныя капіталы ў гэта будаўніцтва.

Часовыя труднасьці з забесьпячэньнем насельніцтва прадметамі шырокага ўжываньня стварылі па рынку напружанае становішча; напружанасьць становішча абумоўлена яшчэ і рэзка выяўленым попытам па тавары і прадукты з боку вёскі ў сувязі з вялікім прыцёкам грошай на вёску па лініі будаўнічых і іншых незямляробчых заработкаў, а таксама і ў сувязі са спэкуляцыяй харчовымі таварамі. **Кулацкія і шкодніцкія элемэнты** скарысталі гэтае становішча па рынку для агітацыі за захоўваньне срэбнай манэты. Гэта кулацка-шкодніцкая агітацыя ішла побач у некаторых мясцох з пашырэньнем ілжывых і недарэчных, а нярэдка і яўна контр-рэвалюцыйных чутак аб тым, што «савецкі ўрад зьнімае са звароту срэбра», што «савецкая ўлада зьбіраецца скасаваць усе грошы, а ўсе тавары будуць разьмяркоўвацца толькі па картках».

Трэба адзначыць, што пашырэньне гэтых злосных чутак супадае з пачаткам разьмяшчэньня пазыкі «пяцігодка за чатыры гады» і зьяляецца контр-рэвалюцыйным выступленьнем супроць тэй кампаніі, якую праводзіць савецкі ўрад сярод працоўных для мабілізацыі іх сродкаў на гаспадарчае будаўніцтва. **Наш клясавы вораг не ганьбуе нічым, каб стварыць лішнюю труднасьць, перашкодзіць і затармазіць пераможнае будаўніцтва сацыялізму ў СССР.**

Некаторыя найбольш адсталыя элемэнты вёскі і гораду пайшлі на павадку ў гэтай грубафальшывай, шкодніцкай агітацыі і пачалі прад'яўляць патрабаваньні па расплату за іх тавары выключна срэбнай манэтай, пачалі хаваць срэбра, а пры расплаце папяровымі грашыма патрабаваць павышаную цану. З прычыны таго, што выпуск срэбра робіцца ў межах, патрэбных для абслугоўваньня **звычайнага, нармальнага** звароту, дык, натуральна, што злоснае спэкуляцыйнае хаваньне яго выклікала недахват срэбнай манэты.

Як жа стаіць справа ў сапраўднасьці?

Першае, што я лічу неабходным рашуча заявіць, гэта тое, што ўсе паданыя вышэй контр-рэвалюцыйныя чуткі зьяўляюцца **абсалютна недарэчнымі.** Мы будуем сваю грашовую гаспадарку на базе цьвёрдага рубля, на ўстойлівасьці і далейшым умацаваньні сілы чарвонца.

Пастановы апошняга зьезду УсеКП(б)Б з выстарчальнай выразнасьцю падкрэсьліваюць неабходнасьць усямернага ўмацаваньня грашовай сыстэмы.

Другое, што я хацеў бы сказаць з гэтага поваду: у бягучым годзе Наркамфін поўнасьцю выконвае вызначаныя гадовым плянам лічбы выпуску разьменнага срэбра. Наркамфін працягвае бесьперапынны выпуск разьменнай манэты і ўзмацнае яго ў 4-м квартале, у сувязі са збожжазагатоўкамі, што поўнасьцю адпавядае гадовым плянам.

Разам з тым, трэба з усёй строгасьцю рэвалюцыйнай законнасьці ўдарыць па элемэнтах, якія пашыраюць і спрыяюць пашырэньню контр-рэвалюцыйных чутак, а таксама па элемэнтах, якія зьбіраюць разьменную манэту ў спэкуляцыйных мэтах. У некаторых асоб знаходзілі па некалькі сот рублёў срэбнай манэты. Ясна, што з такімі спэкулянтамі цацкацца ня прыходзіцца. Трэба, каб уся маса рабочых і сялян зразумела, што **сапраўды вінаватым у затрудненьнях разьмену зьяўляецца наш клясавы вораг; каб уся маса працоўных аказала яму арганізаваны адпор і стварыла ўмовы грамадзкага кантролю, пры якім ня было-б ніякай магчымасьці ні спэкулаваць срэбрам, ні хаваць яго, ня весьці контр-рэвалюцыйнай агітацыі ў зьвязку з разьменнымі затрудненьнямі.**

Я не сумняваюся, што ўжытымі мерамі будзе ў бліжэйшы час адноўлены нармальны грашовы зварот.

Самацек

ЖЛОБІН, 23. (Брыгада **«Зьвязды»**). Так выконваць дырэктывы аб разьвіцьці сьвінаводзтва, як гэта робіць **Жлобінскі** раённы арганізацыі — **нельга.** Ні адна раённая арганізацыя гэтым пытаньнем фактычна не займаецца. Будаўніцтва сьвінаводных калгасаў ідзе самацёкам.

Старшыня Райкалгассаюзу т. **Калясьнёў** на пленуме райкому партыі пастойліва даводзіў, што «будаўніцтва сьвінаводных калгасаў ідзе добра. Галоўная перашкода заключаецца ў нястачы будаўнічых матар'ялаў».

Казённы аптымізм старшыні Калгассаюзу нічога агульнага з сапраўднасьцю ня мае. Паводле пляну 10 сьвінаводных калгасаў павінны былі ўжо прыступіць да будаўніцтва сьвінарнікаў. Фактычна-ж да будаўніцтва так-сяк прыступілі толькі два калгасы. У іншых калгасах будаўніцтва зусім не пачыналася. Райвыканком і Райкалгассаюз ня маюць ніякага ўяўленьня, што і як будуюць калгасы.

У лепшых калгасах раёну («Расьвет-Пераможца», Імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі і Імя 1-га мая) будаўніцтва сьвінарнікаў затрымліваецца, бо няма рабочай сілы і будаўнічых матар'ялаў.

САЛДАЦЕНКА.

На пераезд праваду

ВІЦЕБСК, 24. (Брыгада **«Зьвязды»**). У **Лёзьнянскім** раёне зрываецца будаўніцтва сьвінаводных гаспадарак. Крэдыты, адпушчаныя на гэтыя мэты, не скарыстоўваюцца. Акруговыя і раённыя Калгассаюзы некалькі раз мянялі свае пастановы аб вылучэньні калгасаў пад сьвінаводныя гаспадаркі. Сёньня вылучаюць адзін калгас, а заўтра другі і г. д. Натуральна, што такая бюракратычная «спэцыялізацыя» не дазваляе скарыстаць адпушчаныя крэдыты на будаўніцтва сьвінаводных калгасаў.

На будаўніцтва малочна-жывёлаводных гаспадарак у раёне крэдыты наогул яшчэ не адпушчаны. У агідным становішчы знаходзіцца будаўніцтва сьвінаводнікаў.

ФРОЛАЎ.

Міжнародны зьлёт юных піянэраў

Забарона прыезду ў Берлін аўстрыйскім піянэрам

БЭРЛІН, 24. У гонар другога сусьветнага зьлёту юных піянэраў усе пралетарскія кварталы Бэрліну ўпрыгожаны транспарантамі з рэвалюцыйнымі лёзунгамі і сьцягамі, якія зьвешваюцца з вокан рабочых казарм. Рабочыя бурна ніякі [illegible]ульнае кожная групы замежных піянэраў і на-перабой прапануюць ім пачлег і яду. Усюды замежныя піянэры абкружаны натоўпам рабочых, якія пытаюць у іх аб піянэрскай барацьбе у розных краёх, аб беднасьці іх бацькоў, рабочых. (ТАСС).

Усе нашы сілы—аддамо кампартыі

БЭРЛІН, 24. Зьлёт юных піянэраў заслухаў даклад члена ЦК нямецкай кампартыі т. **Піка.** Прамова т. Піка ня раз перапынялася бурнымі апладысмэнтамі. Забароненая анты - фашысцкая маладая гвардыя перадала на зьлёце вэскім піянэрам сьцяг антыфашысцкай маладой гвардыі. Дэлегат апазыцыйнай часьці сацыял - дэмакрат чэшскага саюзу рабочай моладзі сваё прывітаньне зьлёту закончыў словамі: «Усе нашы сілы мы аддамо кампартыі Нямеччыны».

Пры доўгіх апладысмэнтах вітаў зьлёт прадстаўнік мангольскіх піянэраў.

Першае слова ў дзелавым пасяджэньні другога міжнароднага дзіцячага зьлёту было прысьвечана савецкім піянэрам. Трыбуна была ўпрыгожана рэвалюцыйнымі лёзунгамі і пакрыта морам чырвоных сьцягаў. Прадстаўнік дзяцей Мансфальдзкіх бастуючых рабочых агаласіў тэлеграму зьлёту савецкім піянэрам, а таксама тэлеграмы Камінтэрну, КІМ'у, ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ.

Усе гэтыя тэлеграмы былі ўхвалены **аднагалосна пад гучныя воклічы «Рот Фронт» і сьпяваньне «Інтэрнацыяналу».**

Прывітаньні юных піянэраў ЦК УсеКП(б)

Аднагалосна пад гучныя воклічы «Рот Фронт» і сьпяваньне «Інтэрнацыяналу» [illegible] і ўсім пралетарскім дзецям СССР. СССР—наша бацькаўшчына. Мы клянемся ўсю сваю сілу аддаць на абарону СССР.

Тэлеграма «ЦК УсеКП(б) т. Сталіну» гаворыць: **«Другі міжнародны кангрэс пралетарскіх дзяцей шле шчырае прывітаньне УсеКП(б) і ў яго асобе ўсяму пралетарыяту СССР.**

Няхай жыве УсеКП(б) і яе ЦК!
Няхай жыве т. Сталін»!

Выступленьні піянэраў

БЭРЛІН, 25. Пасяджэньне кангрэсу пралетарскіх дзяцей было адкрыта выступленьнем нямецкага піянэра, які ў простых словах гаварыў аб эксплёатацыі пралетарскіх дзяцей у капіталістычных краёх, іх барацьбе і паказаў на дасканалы прыклад СССР. Аб эксплёатацыі дзяцей, рабочых і сялян у капіталістычных краёх расказвалі і інш. піянэры.

Сустрэчаны бурнымі доўгімі апладысмэнтамі выступае мангольскі піянэр. Ён расказвае аб сацыялістычным будаўніцтве ў СССР і барацьбе савецкіх дзяцей супроць рэлігійнага дурману.

Аўстрыйскім піянэрам прыезд у Бэрлін забаронен

ВЕНА, 21. Ад юных піянэраў Аўстрыі на другі сусьветны зьлёт піянэраў павінна была прыбыць дэлегацыя ў складзе 30 пралетарскіх дзяцей. Учора было атрымана паведамленьне, што дэлегацыі піянэраў Аўстрыі забаронен прыезд у Бэрлін. Камуністычная партыя Аўстрыі склікае мітынг пратэсту. (ТАСС).

Папраўка

Ва ўчарашнім нумары **«Зьвязды»** у артыкуле **«Лічбы перамог»** па тэхнічным недаглядзе дапушчаны грубыя памылкі:

У сёмым радку замест слова... ураднікамі, трэба чытаць... **УДАРНІКАМІ.**

Чуткі аб уходзе Пілсудзкага ўзмацняюцца

ВАРШАВА, 24. Урадавая прэса паведамляе, што Пілсудзкі ў бліжэйшы час варочаецца на сваю дачу пад Варшавай і намераны прысутнічаць на зьезьдзе легіянэраў 10 жніўня ў Радаме. Публічна Пілсудзкі выступаць ня будзе. Прамовы на зьезьдзе скажуць прэзыдэнт Славэк і генэрал Рыдз-Сьмігілы. Зьезд легіянэраў, як падаюць ва ўрадавых колах, будзе мець характар «таварыскага зьлёту». Палітычныя нарады прэзыдыуму і камісій будуць адкладзены на позьнюю восень. Бясспрэчна, што гэты характар зьезду знаходзіцца ў сувязі з адмовай Пілсудзкага выступіць з прамовай, у якой даны былі-б палітычныя пэрспэктывы і ўнесена была-б яснасьць у агульнае становішча. Варшаўская «АВЦ» перадае сёньня падрабязнасьці прыёму Пілсудзкім дэлегацыі легіянэраў. На просьбу арганізатараў зьезду палкоўніка Бяліны і Пражмоўскага прыбыць у Радам Пілсудзкі адказаў адмовай і заявіў, што ён намеран працягнуць свой водпуск і перадае партфэль ваеннага міністра другой асобе. Бяліна безадкладна выехаў з дакладам у Варшаву, і к Пілсудзкаму была зноў паслана дэлегацыя, складзеная з бліжэйшага яго акружэньня, якой удалося ўгаварыць Пілсудзкага фармальна застацца ў складзе ўраду. У сувязі з гэтым пасьледвала назначэньне Канаржэўскага. Пілсудзкі быў таксама згодзен прысутнічаць на зьезьдзе легіянэраў, але без публічнага выступленьня, і адначасова даручыў палкоўніку Бэку высьвятліць умовы лячэньня заграніцай. У палітычных колах перадаюць, што Пілсудзкі не хацеў нават падпісаць назначэньне Канаржэўскага, заявіўшы, што назначаць ваеннага міністра павінен прэзыдэнт. У сувязі з гэтым форма назначэньня Канаржэўскага і прыняла такі дзіўны характар. У апазыцыйных колах лічаць, што такое няпэўнае становішча будзе працягвацца да восені.

Катовіцкая «Палёнія» сьцьвярджае, што адхіленьне Пілсудзкага ад непасрэднага ўдзелу Пілсудзкага — дакананы факт, што гэты факт зьявіўся для са- [illegible]

Скончыць у баявым парадку падрыхтоўку да хлеба загатовак

Узяцца за выкананьне загатоўчых плянаў

У гутарцы з нашым супрацоўнікам наркамгандлю БССР **тав. Балцін** паведаміў аб ходзе падрыхтоўкі да збожжазагатовак.

На гледзячы на тое, што Саўнарком даўно ўжо зацьвердзіў асноўныя ўстаноўкі па збожжазагатоўках, збожжазагатоўчыя арганізацыі і Саюзхлеб дагэтуль яшчэ не раскачаліся.

Усё яшчэ ня ўжыты рашучыя меры да ўзмацненьня і разьвіцьця пізавой загатоўчай сеткі спажывецкай каапэрацыі, на якую ўскладзена асноўная задача на правядзеньні збожжазагатовак у бягучым сэзоне.

Ня лепш абстаіць справа з мабілізацыяй складзкай плошчы, у прыватнасьці ёсьць значныя прарывы ў ходзе будаўніцтва новых складаў. Вызначаны да скончаньня будаўніцтва тэрмін даўно ўжо мінуў, а будаўніцтва пасоўваецца вельмі слаба.

Ня ўжыты таксама практычныя меры да прывядзеньня ў баявую гатоўнасьць транспартнай сеткі.

Нездавальняючае становішча з таравю.

Трэба проста сказаць, што тыя тэмпы падрыхтоўкі, якія мы маем на сёньняшні дзень ня могуць нас задаволіць і ў далейшым неацярпімы. Час папраўджаньняў ужо мінуў. Дні, якія засталіся да пачатку збожжазагатовак, павінны быць цалкам скарыстаны для таго, каб падраўнець слабыя вучасткі.

Асабліва важнае значэньне набывае падрыхтоўка раённага загатоўчага

За праваапартуністычную практыку распушчана ЦП саюзу сувязі

ЦП абыходзіла важнейшыя палітычныя кампаніі, было адарвана ад мас, не кіравала іх творчым энтузіязмам, не змагалася супроць засьмечанасьці апарату, шкодніцтва і заціску самакрытыкі.

Забясьпечыўшы цьвёрдае парткіраўніцтва, усе прафарганізацыі БССР павінны дапамагчы саюзу сувязі перабудаваць сваю работу, аслабаніцца ад апартуністых, дабіцца рашаючых посьпехаў у выкананьні і перавыкананьні кантрольных лічбаў.

У практыцы асобных прафсаюзаў БССР мы мелі рад праваапартуністычных скажэньняў лініі партыі ў прафрабоце. У мінулым годзе была выкрыта праваапартуністычная лінія ў рабоце ЦП саюзу саўгандальслужачых. ЦП гэтага саюзу не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі перыяду.

Яно адарвалася ад масы—кіравала габінэтна, фактычна плялося ў хвасьце мас, абыходзіла важнейшыя палітычныя кампаніі, ігнаравала гаспадарчыя пытаньні, прымірэнча адносілася да скрыўленьняў клясавай лініі фінорганамі, ня кіравала сацспаборніцтвам, заціскала самакрытыку, культурна-асьветную работу праводзіла адарвана ад палітычных задач дня.

ЦСПСБ у свой час даў належную ацэнку гэтай праваапартуністычнай лініі ў прафрабоце, адпавіў кіраўніцтва ЦП саюзу саўгандальслужачых, мабілізаваў увагу ўсіх прафарганізацый БССР вакол урокаў праваапартуністычнага банкрутства ЦП гэтага саюзу.

Праваапартуністычная практыка, якая выкрыта зараз у **рабоце ЦП саюзу сувязі** паказвае, што некаторыя прафарганізацыі ня толькі ня ўлічылі вышэйпаказаных урокаў, але фактычна праводзілі тую-ж лінію, што і ЦП саюзу саўгандальслужачых.

Сувязь адыгрывае вялікую ролю ў справе культурна-палітычнага выхаваньня шырокіх мас працоўных. Сувязь у пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва набывае асаблівае значэньне, як сродак пралетарскага ўплыву гораду на вёску. Між тым, гэта галіна гаспадаркі значна адстала ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Адсюль зусім відавочна тая роля, якую павінны адыгрываць прафсаюзныя арганізацыі ў справе падцягненьня гэтага вучастку народнай гаспадаркі.

Як ЦП саюзу мабілізавала ўвагу членскай масы вакол задач сувязі, як ЦП саюзу перабудавала сваю работу над кутом павароту тварам да вытворчасьці?

Прафарганізацыі сувязі, пазбаўленыя кіраўніцтва з боку ЦП саюзу, правальвалі важнейшыя палітычныя кампаніі.

Сацыялістычнае спаборніцтва амаль на мела ніякага распаўсюджаньня ў рабоце апаратаў сувязі. Паштова-тэлеграфная кантора ў Воршы абвясьціла сябе ўдарнай, але аднеслася да гэтае справы па-казённаму, ніякіх канкрэтных абавязацельстваў работнікі на сябе ня ўзялі і ў выніку сацспаборніцтва было правалена. Ударныя брыгады ў Віцебску і Менску, а прычыны адсутнасьці кіраўніцтва імі разваліліся. Кантрольныя тэрміны апрацоўкі карэспандэнцый, якія былі прысланы НКПТ, вытворныя каштарысы-планы і кантрольныя лічбы будаўніцтва ня былі давезены да мас і ў большасьці ня выкананы.

Ніякай барацьбы з засьмечанасьцю апаратаў сувязі саюз не праводзіў. Як высьвятлілася пры абсьледваньні ЦСПСБ, апараты сувязі на 50 проц. засьмечаны чыноўнікамі старога часу. На барацьбу з фактамі шкодніцтва, якія мелі месца ў рабоце апаратаў сувязі ў Воршы, Бабруйску, Віцебску і Менску, ня была сканцэнтравана грамадзкая думка.

Абсьледваньне выявіла, што самакрытыка ў саюзе была ў загоне. Насьценныя газэты ў большасьці «стрымлівалі тон», і таму не карысталіся аўтарытэтам сярод саюзнай масы, яны не адбівалі палітычных задач дня, не мабілізавалі ўвагу членаў саюзу вакол гэтых задач. Нават і на тыя «бяскрыўдныя» карэспандэнцыі, якія зьмяшчаліся ў газэтах, не даваліся адказы, яны заставаліся без рэагаваньня. У Віцебску і Воршы былі факты заціску самакрытыкі, факты цкаваньня рабкораў, але яны ня былі належным чынам ацэнены вышэйшымі саюзнымі арганізацыямі.

Прафсаюзныя арганізацыі сувязі зусім не займаліся пытаньнямі вылучэньня і арабочваньня апарату, не мабілізавалі актыўнасьць саюзных мас на змаганьне за клясавую бязадольнасьць і выразнасьць работы апарату сувязі.

Зусім відавочна, што ўсе гэтыя прарывы зьяўляюць вынікам праваапартуністычнага кіраўніцтва з боку цэнтральнага праўленьня, саюзу сувязі.

ЦК КП(б)Б, заслухаўшы інфармацыю фракцыі ЦСПСБ, пастанавіў распусьціць ЦП саюзу сувязі, зьняць з работы кіруючых працаўнікоў ЦП, перадаўшы аб іх справу ў ЦКК КП(б)Б. Зацьверджана спэцыяльная арганізацыйная камісія па скліканьні пазачарговага зьезду саюзу.

Гэта важнейшая пастанова ЦК павінны быць улічана партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі БССР. Трэба тэрмінова прыступіць да перабудовы работы прафарганізацый сувязі, рашуча аслабаняючы кіраўнічыя органы ад праваапартуністычных элемэнтаў, якія тармозяць гэту перабудову.

На дапамогу саюзу сувязі ў правядзеньні гэтай работы павінны прыйсьці мясцовыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі.

Урокі ЦП саюзу сувязі павінны быць шырока папулярызаваны сярод масы членаў прафсаюзаў. Прэзыдыум ЦСПСБ прыняў канкрэтныя прапановы па гэтым пытаньні. Адначасова прэзыдыум адзначыў, што з боку асобных АПБ і з боку самога прэзыдыуму ЦСПСБ да апошняга часу наглядалася недаацэнка і невыстарчальная ўвага рабоце саюзу сувязі.

Узмацненьнем увагі рабоце саюзу сувязі з боку ўсіх прафсаюзных арганізацый, разгарнуўшы бязьлітасную барацьбу з апартуністамі, саюзная арганізацыя сувязі пад кіраўніцтвам партыі ўдарнымі тэмпамі, мэтадам пралетарскай самакрытыкі правядзе перабудову ўсёй сваёй работы, даб'ецца рашаючых посьпехаў у разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, у выкананьні і перавыкананьні кантрольных лічбаў.

Р. Д.

ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ

Усе лішкі хлеба толькі дзяржаве

КАЛГАСЬНІКІ ПЕРШЫМІ ВЯЗУЦЬ ХЛЕБ.

У калгасах **Нова-Златапольскай МТС** (Трактарацэнтр) абмэлот хлеба ў разгары. У раённы цэнтр Нова-Златаполь (Запарожжа) прыбываюць чырвоныя абозы з хлебам. На чырвоных сьцягах лёзунгі: **«Першы хлеб дзяржаве».**

Сацспаборніцтва па здачы хлебных лішкаў ахапіла ўвесь раён. Пярэдніцтва належыць зараз Раеўскаму калгасу, які распачаў малацьбу 19 ліпеня і сдаў 20 ліпеня на элеватар **150 цэнтнэраў пшаніцы.**

КАЛГАСЬНІКІ І ІНДЫВІДУАЛЬНІКІ АРГАНІЗАВАЛІ СУПОЛЬНЫ ЧЫРВОНЫ АБОЗ

ТЫРАСПОЛЬ. Калгасы АМССР пачалі ўзмоцнена здаваць дзяржаве хлеб новага ўраджаю. Першыя чырвоныя абозы калгасаў былі арганізаваны ў Чырвона-Охінскім раёне і даставілі на ссыпныя пункты **72 тоны хлеба.** У Слабадзейскім раёне калгасы і індывідуальнікі арганізавалі вялізарны раённы чырвоны абоз ім. **16 партзьезду.**

Паводле вестак Наркамзему АМССР, у рэспубліцы ўбрана 94 тыс. гэкт. хлеба новага ўраджаю.

ПЕРШЫЯ ПЕРАВОЗКІ ХЛЕБА МОРАМ

АДЭСА. Пачаліся першыя перавозкі хлеба морам. У Адэскую гавань прыбылі ўжо першыя парусна-маторныя лодкі, якія за два дні даставілі 150 тон пшаніцы. Цяпер штодзенна пачало прыбываць з Хэрсону, Скадаўску і інш. раёнаў Чорнаморскага ўзьбярэжжа па 120 тон пшаніцы.

ЧЫРВОНЫ АБОЗ З НОВЫМ ХЛЕБАМ

ХАРКАЎ. Гаўрылаўская арцель імя Леніна і Сталінская арцель «К победе» здалі 21 ліпеня першы чырвоны абоз у колькасьці 20 тон чыстагатуновай пшаніцы новага ўраджаю. На мітынгу, які адбыўся ў Новай Вадалазе, калгаснікі, даставіўшы чырвоны абоз, заявілі, што яны працавалі днём і ноччу для таго, каб як мага хутчэй здаць дзяржаве хлеб новага ўраджаю.

70 ТОН ЗБОЖЖА ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ

На Адэшчыне ўборка ўраджаю ідзе невыстарчальным тэмпам. На 15 ліпеня ў акрузе скошана 303.500 гэкт., што складае толькі 28,8 проц. пляну.

У бліжэйшыя дні заканчваюць уборку толькі Адэскі, Авідыпольскі, Спартакаўскі і паўднёвыя раёны.

Калгасы здаюць першы хлеб новага ўраджаю **чырвонымі абозамі.** Арцель «Прабуджаньне» (Камінтэрнаўскага раёну), засеяўшая 8 гэкт. пшаніцы ў падарунак адэскай акрпартканфэрэнцыі, учора даставіла ў Адэсу ўраджай з гэтага засеву ў колькасьці **70 тон збожжа.**

Многа бадзёрасьці і энтузіязму уносяц 1.500 камсамольцаў і студэнтаў, пасланыя на ўборку ўраджаю; яны заражаюць сваім працоўным энтузіязмам калгасную масу.

***

КІЕЎ, 22. 21 ліпеня позна вечарам, ня гледзячы на моцны дождж, у Кіеў прыбыў першы чырвоны абоз, арганізаваны 7-ю калгасамі Макараўскага раёну. Хлеб быў беражліва закрыты брэзэнтам. Абоз быў упрыгожаны чырвонымі сьцягамі, плякатамі і лёзунгамі. Рабочыя заводу «Чырвоны Пахар» выйшлі насустрач абозу з аркэстрам і падарылі для патрэб калгасаў 2 сяўрэкі. Ля заводу «Бальшавік» адбылося ўрачыстае спатканьне калгаснікаў з рабочымі мясцовых прадпрыемстваў. Калгаснікі пастанавілі **не прадаваць ні аднаго кілёграма хлеба прыватнікамі.** (ТАСС).

АРЦЁМАЎСК, 22. Чатыры калгасы Чырвонапахарскага сельсавету імя Пятроўскага, ім. Войкава, «Бальшавік» і «Южный Хлебороб», арганізавалі чырвоны абоз з 60 фурманак і здалі на Арцёмаўскі ссыпны пункт Саюзхлеба 360 цэнтнэраў хлебных лішкаў. Гэтыя калгасы намячаюць да здачы 10.100 цэнтнэраў хлеба — **у тры разы больш,** чым летась, або на 150 проц. больш плянавых меркаваньняў гэтага году. (ТАСС).

Вялікая арктычная экспэдыцыя

9 ліпеня на ледаколе «Седаў» савецкі ўрад выслаў вялікую арктычную экспэдыцыю. Гэтая экспэдыцыя павінна прайсьці да зямлі Франца Іосіфа, а адтуль на Паўночную Зямлю ў пяршыню адкрытую летам 1913 г. На Паўночнай Зямлі экспэдыцыя пакіне партыю зімоўшчыкаў з 4 чалавек. У склад яе ўваходзяць: начальнік яе **т. Ушакоў** (які тры гады зімаваў на выспе Уранела) і геолёг **т. Урванцоў** (дасьледчык Нарыльскага краю і Таймырскае паўвыспы). Апроч іх у склад партыі ўвойдуць радыёт каротка-хвалявік і прамысловец. Партыя гэта будзе мець у сваім распараджэньні 40 усходня-сібірскіх сабак, пры дапамозе якіх можна будзе рабіць далёкія экскурсіі. Гэта партыя забясьпечана рознымі навуковымі інструментамі па мэтэаралёгіі, арклёгіі і геафізыцы, а таксама інструментамі для акрасьленьня астранамічных пунктаў і тапаграфічных здымкаў. 4 сьмельчаком прадстаіць цяжкая, але надта цікавая задача — абсьледаваць Паўночную Зямлю.

Пасьля гэтага арктычная экспэдыцыя, зрабіўшы некаторыя досьледы ў арктыцы, вернецца назад.

***

Ледакол «Седаў». 21 ліпеня ўвечары, нарэшце, сустрэлі лёд на шырыні 77½ градусаў. Усе ажыўлены і радасна вітаюць лёд, таксама «Седаў» уваходзіць у сваю родную стыхію. Цяжкі быў паход на адкрытым моры. Быў бесьперапынны штармавы вецер. Вялікі дождж заліваў палубу. Людзі намучыліся. Рознастайнасьць уносьлі два заходы на Новую Зямлю, адкуль узялі прамысловцаў для зімоўкі на зямлі Франца. Палярнічых для зімоўкі знайшлося шмат. Выбралі двух самых вопытных. На час стаянак мясцовыя жыхары — рускія і самаеды наведвалі ледакол і з вялікай зацікаўленасьцю аглядалі кароў, якія знаходзіліся на барту і якіх многія бачылі ў першы раз.

Начальнік экспэдыцыі ШМІДТ.

Усім ячэйкам МОПР'у Кастрычніцкага райкому.

27 ліпеня а 7 г. веч. у памяшк. Акруговму МОПР'у (Савецкая, 87,2-гі паверх)

адбудзецца

НАРАДА БЮРО ЯЧЭЕК МОПР'у,

рэўкамісіі і актыву Кастрычніцкага райкому.

У порадку дня—пытаньне аб перавыбарчай кампаніі МОПР'у.

—) ПРОСЬБА ЗЬЯВІЦЦА СВАЛЧАСОВА. (—

Партыйнае будаўніцтва

УЗМАЦНЕНЬНЕ ВЯСКОВАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ—

неабходная прадпасылка сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі

На жорсткую барацьбу з праявамі правага ўхілу на практыцы.—Правых апартуністых - прыхільнікаў і выканаўцаў кулацкай праграмы—за борт партыі

Неабходная прадпасылка

Уборка ўраджаю, якая пачалася ў значнай частцы раёнаў, і падрыхтоўка да яе падкрэсьліваюць правільнасьць і своячасовасьць дырэктывы XVI партзьезду. «Колькаснае і якаснае ўзмацненьне гэтай арганізацыі, стварэньне моцных партыйных ячэек у саўгасах і калгасах, ператварэньне саўгасаў і калгасаў у апорныя пункты партыйнай работы ў вёсцы, уцягненьне ў партыю с.-г. рабочых, батракоў і лепшых калгаснікаў, пастаноўка на адпаведную вышыню работы сярод беднаты, жанчын і моладзі ў калгасах становіцца неабходнай прадпасылкай пасьпяховай работы партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі».

Уборачная і асеньняя пасеўныя кампаніі зьяўляюцца важнейшымі палітычнымі кампаніямі, якія партыя праводзіць на вёсцы. Гэтыя кампаніі, якія праходзяць ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня, пры надзвычайна актыўным супраціўленьні кулацтва, зьяўляюцца адным з рашаючых баёў за калектывізацыю.

Партыйныя арганізацыі вёскі павінны мабілізаваць усе свае сілы для пасьпяховага правядзеньня гэтай кампаніі, для правільнага разьмеркаваньня ўраджаю па прынцыпу колькасьці і якасьці затрачанай працы. Партыйная арганізацыя вёскі павінна мабілізаваць бяднякоў-батрацкія і серадняцкія масы вёскі, для таго, каб даць рашучы адпор узмоцненай актыўнасьці кулацтва, яго спробам узарваць калгасы, узяць на буксір беднякоў і сераднякоў.

Першыя зводкі з фронту ўборкі гавораць аб тым, што там, дзе партыйныя арганізацыі выконваюць дырэктывы партыі, там, дзе дан адпор апартуністычным тэорыям і настроям аб самацёку, там, дзе праведзена работа з беднатой, там, дзе даецца адпор кулаку — там уборачная кампанія праходзіць з поўным посьпехам. Варта адзначыць работу Праскуранцкай ячэйкі калгасу імя 12-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі. Работа гэтай ячэйкі ў галіне калектывізацыі, у галіне падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі можа зьявіцца сапраўдным узорам бальшавіцкай работы. Для правядзеньня ўборкі мабілізавана ўся маса калгаснікаў. Ячэйка намагае ўсе свае сілы для арганізацыйнага і гаспадарчага замацаваньня калгасу. Ячэйка правяла шырокую масавую растлумачальную работу сярод калгаснікаў па разьмеркаваньні ўраджаю. Ячэйка мабілізуе калгаснікаў, індывідуальнікаў для адпору кулаку.

Ячэйка аказвае дапамогу вакольным індывідуальнікам. Таму ячэйка карыстаецца аўтарытэтам, таму ячэйка спраўляецца з тымі задачамі, якія партыя паставіла перад вясковай партыйнай арганізацыяй.

Пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі магчыма толькі ў бязьлітасным змаганьні з правымі апартуністымі, якія на справе падрываюць работу нашых ячэек, якія выконваюць кулацкую праграму, сваёй арыентоўкай на самацёк.

У сённешнім нумары падаем цэлы рад фактаў з Лепельшчыны, Капыльшчыны і іншых раёнаў, якія гавораць аб тым, як права-апартуністычная практыка разбройвае партыйную арганізацыю, стаўка на самацёк непасрэдна дапамагае кулаку, дапамагае розлагаць калгасы.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што нельга праводзіць змаганьне за калектывізацыю, нельга правесьці з посьпехам уборачную кампанію, не зламаўшы хрыбет правым апартуністым — агентуры кулацтва ў нашых радох, ня выкінуўшы іх за борт нашай партыі.

Партыйныя арганізацыі вёскі топкі ў рашучай барацьбе на два фронты, накіроўваючы галоўны агонь супроць правага ўхілу, справяцца з тымі задачамі, якія перад імі сталць.

„Чаму правы ўхіл зьяўляецца зараз галоўнай небясьпекай у партыі? Таму, што ён адбівае кулацкую небясьпеку, а кулацкая небясьпека ў сучасны момант разгорнутага наступленьня і выкарчоўваньня карэньняў капіталізму зьяўляецца асноўнай небясьпекай у краіне". (І. СТАЛІН).

Узор бальшавіцкай работы

Праскуранцкая парт'ячэйка калгасу імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі» правяла вялікую работу па калектывізацыі. У выніку бальшавіцкай работы яе членаў, Затонскі сельсавет калектывізаваны на 24,3 проц. і зьяўляецца першым у раёне адносна калектывізацыі.

Весневая сяўба — першая калектыўная сяўба ў калгасе — была праведзена па-баявому. Пасьпяховым правядзеньнем кампаніі сяўбы былі замацаваны калгасы імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі ў 62 гаспадаркі і «Дняпроўск» у 16 гаспадарак.

Цяпер, у часе ўборкі, ячэйка праводзіць барацьбу за далейшае разгортваньне калектывізацыі.

Перш за ўсё, праскуранцкая парт'ячэйка, напярэдадні ўборкі ўраджаю вялікую работу правяла па падрыхтоўцы да ўборкі і асеньняй пасеўнай кампаніі. На сваім сходзе ў прысутнасьці сотні калгаснікаў і індывідуальнікаў быў шырока абмеркаваны плян уборкі і пасеўнай кампаніі. Плян своячасова быў даведзены да кожнага калгасу і кожнага брыгадзіра, да калгаснікаў і вёскі.

У раёне дзейнасьці ячэйкі ёсьць два калгасы — імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі і «Дняпроўск». Калгасы маладыя. Яны арганізаваны напярэдадні весняной пасеўнай кампаніі. Ня гледзячы на гэта маладыя калгасы за 6 месяцаў работы замацаваліся і яшчэ больш разьвіваюцца гаспадарча. У барацьбе за замацаваньне калгасу парт'ячэйка правяла вялікую работу сярод калгаснікаў.

У часе весняной сяўбы калгас быў на краю развалу. Але тут ячэйка выступіла ў ролі арганізатара батрацка-бяднацкіх мас калгасу. Беднота была своячасова мабілізавана для адпору кулаку. **Кулаку быў даў эмпучы адпор.**

— Праведзеныя 8 сходаў беднаты былі лепшым сродкам замацаваньня калгасу, — успамінае сакратар ячэйкі КП(б)Б Рабцаў.

Цяпер навакол парт'ячэйкі **ўтварыўся моцны бядняцка-серадняцкі актыў.** Гэты актыў рашуча змагаецца за замацаваньне калгасу. Актыў задае тон ва ўсёй рабоце калгасу і сельсавету.

Праскуранцкая парт'ячэйка першай у Бабруйшчыне, сьледам за калгасам «Расьсьвет-Пераможца», праз ударныя тэмпы работы, дабілася своячасовай уборкі ўсяго ўраджаю — 130 гэкт. Калгас імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі першым у раёне ўбраў свой ураджай, толькі дзякуючы тым бальшавіцкім тэмпам, якія былі ўведзены па пачыну ячэйкі.

Ячэйка першая ў акрузе (пасьля «Расьсьвет-Пераможца») на сваім сходзе абмеркавала пытаньне разьмеркаваньня новага ўраджаю. Першымі ў БССР, калгаснікі з «12-годзьдзя Кастрычніцкай Рэвалюцыі» рапартуюць аб сканчальнай уборкі:

«Ураджай азімых збожжавых — 134 гэкт. ужо ўбралі цалкам і распачалі абмалот. Дапамагаем беднякам-індывідуальнікам, — пішуць яны ў рапарце, — рамонтуем калёсы, ладзім сярпы... пабудавалі новы хлеў для рагатае жывёлы на 100 галоў, распачынаем будаўніцтва сьвінарнікаў, для чаго вывезьлі лес, рыхтуем матар'ял...»

Усе пытаньні будаўніцтва калгасу, дапамога індывідуальнікам, жывёлагадоўля не праходзяць міма парт'ячэйкі. Ячэйка праз сваіх членаў партыі — калгаснікаў і калгасны актыў кіруе ўсім жыцьцём калгасу і барацьбой за калгас.

Ячэйка, сваёй ударнай работай, праз добрую арганізацыю працы ў калгасах, праз правядзеньня масавай растлумачальнай работы сярод індывідуальнікаў, праз дапамогу індывідуальнікам паказвае узор бальшавіцкай работы. **Па ёй трэба раўняцца.**

Брыгадзір «Зьвязды»
САЛДАЦЕНКА.

Адпачылі на апартуністычных лаўрах

Як відома, ў **Калінкавіцкім** раёне (Мазырскае акругі) ў часе весняной пасеўнай кампаніі былі дапушчаны грубейшыя антысяраднядкія перагібы і скажэньні лініі партыі.

За гэтыя перагібы было распушчана бюро РК партыі і зьменена ўсё раённае кіраўніцтва, а некалькі вінаватых аддадзены пад суд.

Дзякуючы энэргічнай барацьбе, якая была праведзена пасьля з гэтымі перагібамі, удалося перавесьці на новы статут 35 проц. гаспадарак раёну. Дзякуючы ўздыму энтузіязму калгаснікаў яны вытрымалі баявы экзамэн у часе весняной сяўбы.

Але **раённае кіраўніцтва на гэтым супакоілася** і замяніла асноўныя лёзунгі партыі праваапартуністычнай стаўкай на самацёк. Ніякай работы сярод калгаснікаў, а асабліва сярод беднаты за гаспадарчае замацаваньне калгасаў, за папярэньне базы калектывізацыі, пачынаючы ад сакавіка ў раёне не вядзецца. За тры апошнія месяцы пытаньні калектывізацыі не сталі ні разу ні на бюро РК, ні на райпартсходзе.

Нячувана актыўная работа кулацтва не знаходзіла адпору. Раённае кіраўніцтва моўчкі згаджалася з лёзунгам, які кулацтва выкінула і ўзмоцнена прапагандавала аб тым, што «савецкая ўлада скасавала калектывізацыю». У выніку гэтага, пад напорам кулацкай агітацыі, з прычыны поўнай адсутнасьці работы з беднатой і адпору кулацкай шкодніцкай працы развальваюцца ня толькі новыя, але і некаторыя старыя калгасы. Некалькі прыкладаў: у в. Косятаў кулакі рознымі спосабамі давалі досыць моцны калгас «Чырвоная Зьмена» да развалу. У барацьбе з кулацтвам калгаснікі не атрымалі ніякай дапамогі з боку раёну. Работа з беднатой не вялася. «Ад часу пераходу на новы статут, да нас ніхто не прыехаў, каб правесьці сход, каб параіць, як нам быць» —кажуць калгаснікі.

З 15 гаспадарак засталося толькі дзьве. Калгас імя «XII гадавіны Кастрычніка» (Какуявіцкі сельсавет) разваліўся. Калгас «Халаднікі»—самы моцны ня толькі ў раёне, але ва ўсёй акрузе, быў напярэдадні развалу, з прычыны таго, што ніякай работы з боку партарганізацыі ня было. Вызавкам падкулачнікаў ня было дадзена адпору. Калі шмат калгаснікаў падалі заявы аб выхадзе, у калгасы прыехалі таму, што гэта буйны калгас. Калі развальваюцца малыя калгасы, дык ніхто не прыяжджае. Гэта тыпова. У раёне поўнасьцю адсутнічае зацікаўленасьць да існаваньня, замацаваньня і пашырэньня малых калгасаў і арцеляй.

А вось некаторыя **вынікі праваапартуністычнай практыкі ў Калінкавіцкім раёне.** З 35 проц. гаспадарак, перайшоўшых на новы статут, засталося на 20-е мая 20 проц., а на 1-е ліпеня—11,8 проц. гаспадарак раёну. На сёняшні дзень яшчэ менш, таму, што ячэйкі сьпяць непрабудным сном, у той час, калі кулак ня дрэмле. **Трэба неадкладна прыняць рашучыя меры для спыненьня гэтай праваапартуністычнай практыкі.**

Брыгадзір «Зьвязды» Тоўсьцін.

Сьпячка ў час бою

Дырэктывы партыі аб узмацненьні партыйнай работы ў калгасах, аб разгортваньні масавай палітычна-выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў зусім ігнаруюцца ў Лельчыцкім раёне.

Амаль усе калгасьнікі скардзяцца на тое, што райком партыі і партыйныя ячэйкі праводзяць работу ў калгасах ад кампаніі да кампаніі. У большасьці калгасаў раёну не завострана ўвага калгасьнікаў аб значэньні ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі. Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі праводзілася бюракратычна: прыяжджаў агранам, або працаўнік райпаляводсаюзу, напісаў плян уборачнай кампаніі і гэтым абмяжоўваліся.

Кулак пралёўляе нябывалую актыўнасьць і прыкладае ўсе свае сілы для развалу калгасаў. Нартыйныя ячэйкі ў той-жа час сьпяць.

Характэрна, што ні ў адным калгасе раёну ня былі растлумачаныя тэзісы дакладу т. Ягаўлева на зьезьдзе. Зусім ня дзіва, што ні адна парт'ячэйка за выключэньнем Буйнавіцкай, не абгаварыла тэзісы да XVI партзьезду. Нават лельчыцкая партыйная ячэйка, дзе знаходзіцца ўвесь партактыў таксама не абгаварыла гэтых тэзісаў.

Работа сярод беднаты зусім заглохла. Усё гэта спрыяе таму, што ўборачная кампанія, якая ўжо распачалася, праходзіць зусім павольна. Ні ў адным калгасе не разгорнута ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Калгасы нічога ня робяць для дапамогі індывідуальнаму сэктару.

Таксама ня выконваюцца дырэктывы аб уцягненьні ў партыю калгасьнікаў.

Заявы, якія калгасьнікі падаюць у партыю трымаюцца месяцамі, не разглядаюцца. Напрыклад, калгасьнікі «Зру ху» падалі заяву аб уступленьні ў партыю ў колькасьці 7 асоб, ужо больш трох месяцаў, а адказу няма. Двое калгасьнікаў «Шляху сацыялізму», якія падалі заявы аб уступленьні ў партыю, таксама не атрымліваюць ніякага адказу.

Зразумела, што гэтае ігнараваньне дырэктыў партыі аб рабоце сярод калгасьнікаў выкарыстоўвае кулак.

Брыгадзір «Зьвязды» Махцін.

Там, дзе забыты дырэктывы партыі

Бюро Аршанскага РК КП(б)Б абгаварыла ход падрыхтоўкі да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі на Аршанскай акрузе. Трэба канстатаваць, што становішча падрыхтоўчай работы па многіх раёнах—зусім нездавальняючае. Гэтым важнейшым кампаніям удзяляецца зусім мала ўвагі. Асабліва трэба сказаць гэта пра Дрыбінскі, Талочынскі, Горацкі, Чарэйскі і Аршанскі раёны. Пляны ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі не ва ўсіх раёнах даведзены да калгасу, сяла і двара, не мабілізавана грамадзкая думка шырокіх бядняцкіх і серадняцкіх мас вакол задач уборкі і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Райкомы партыі і акрэкалгассаюз не аддаюць патрэбнай увагі пытаньням гаспадарча-арганізацыйнага замацаваньня існуючых калгасаў. Зусім нездавальняюча праводзіцца работа з беднатой у калгасах, у выніку чаго наглядаецца па некаторых раёнах адліў з калгасаў, (асабліва па Дрыбінскім, Горацкім, Талочынскім, Чарэйскім і Аршанскім раёнах).

Райкомы і ячэйкі невыстарчальна мабілізавалі шырокія батрацкія і бядняцка-серадняцкія масы вёскі на барацьбу з кулацтвам, якое накіроўвала сваю актыўнасьць да разбурэньня калгасаў і зрыву ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Бюро Аршанскага акругкому абвясьціла **вымову бюро дрыбінскага райкому партыі** за слабую падрыхтоўку да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, за адсутнасьць работы па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў. АК абвясьціў таксама **вымову францыі акрпалгасаюзу** за слабае кіраўніцтва калгасным рухам у акрузе і г. д.

С.

Выстаўка „Пяцігодка—за чатыры гады"

25-га чэрвеня ў Маскве ў парку Культуры і Адпачынку адчынілася выстаўка «Пяцігодка — за чатыры гады». Гэта выстаўка зьяўляецца першай спробай даць папулярнае ўяўленьне аб цыкгодовым пляне будаўніцтва нашай народнай гаспадаркі і аб фактычным выкананьні гэтага пляну.

Ставячы галоўнай мэтай прапаганду пяцігодкі і ўцягненьне ў сацыялістычнае будаўніцтва шырокія масы працоўных, выстаўка не прэтэндуе на вычарпальную паўнату, але ў жывой і мастацкай форме дае ўяўленьне аб усім будаўніцтве ва ўсіх галоўнейшых галінах народнае гаспадаркі.

Агульны адцэл выстаўкі ў дыяграмах і фотамантажах знаёміць наведвальніка з ростам насельніцтва краю, энэргаўзброенасьцю, з запасамі нашых апалавых багацьцяў, з электрыфікацыяй Саюзу, з валавой прадукцыяй усёй нашай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, з валавой прыбытковасьцю краю, з бюджэтам, з капіталаўкладаньнямі ў прамысловасьць, у сельскую гаспадарку і транспарт.

Некаторыя дыяграмы даюць уяўленьне аб росьце нашай нижкой індустрыі, росьце транспарту, апрацоўчай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, аб абагуленьні ў сельскай гаспадарцы і росьце ўраджайнасьці. Некалькі дыяграм характарызуюць рост нашай прамысловасьці, параўнаўча з ростам у галоўнейшых капіталістычных краёх, а таксама паказваюць эмену ўдзельнае вагі асобных раёнаў, у сувязі з інтэнсыўным ростам прамысловасьці ў Сібіры, на Ўрале і ў інш. мясцох. Наведвальніку даецца ўяўленьне аб якасных заданьнях пяцігодкі, аб зьніжэньні сабекошту, аб росьце заработнай платы і зьмяншэньні беспрацоўя.

Дзьве вялікія залі адведзены пад экспанаты асобных аб'яднаньняў, саюзаў і трэстаў. Канкрэтныя даныя асобных адзінак зьяўляюцца выразным пацьвярджэньнем нашага бязумоўнага і выключнага па тэмпу прамысловага росту.

На даху выставачнага павільёну ўстаноўлена электрычная газэта, якая ўпяршыню дэманструецца ў СССР. На вялікім шчыце рушыцца бязупынны сьветавы тэкст, які дае магчымасьць перадаць лёзунгі, паведамленьні, навіны. Тэкст чытаецца, як на тэлеграфнай

Ліквідацыю акруг, узмацненьне раёнаў— у цэнтр увагі савецкай грамадзкасьці!

...Ва ўсёй рабоце па ліквідацыі акруг выходзіць з асноўнай задачы максымальнага набліжэньня партыйнага, савецкага, каапэрацыйнага і прафэсыянальнага апарату да раёну і вёскі

Забясьпечыць дасканалае штодзённае кіраўніцтва ўсёй практычнай работай па ліквідацыі, мабілізаваўшы актыў для пасьпяховага і хутчэйшага правядзеньня рэарганізацыі. (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня).

Як рэарганізаваць зямельны апарат

Што прапануе камісія Наркамзему

Пры практычным ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў па ліквідацыі акруг паўстае многа вельмі складаных пытаньняў, ад правільнага вырашэньня якіх залежыць пасьпяховая перабудова апарату цэнтральных і мясцовых органаў. Асабліва шмат пытаньняў паўстае пры перабудове апарату зямельных органаў і калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы, работа якіх непасрэдна зьвязана з сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскае гаспадаркі.

Рознастайнасьць функцый апаратаў земоргана, калгаснай і каапэрацыйнай сыстэмы патрабуе асаблівай увагі да пытаньня рацыянальнай перабудовы апарату, каб пазбавіцца ад паралелізму, каб найлепш разьмеркаваць наяўныя кадры і пазбавіцца ад лішніх выдаткаў на утрыманьне апарату.

Дагэтуль мы мелі рад перабояў у працы ў выніку заблытаных узаемаадносін паміж асобнымі арганізацыямі, якія правядзілі ў галіне сельскай гаспадаркі.

Наркамзем БССР зараз распачаў работу на рэарганізацыі апарату зямельных органаў калгаснай і каапэрацыйнай сыстэмы, у сувязі з ліквідацыяй акруг. Гэтым займаецца спэцыяльна вылучаная камісія.

Паводле папярэдніх меркаваньняў камісіі, намечана наступная структура цэнтральнага апарату НКЗ. Апарат складаецца з 8-мі сэктараў — навуковых і навучальных устаноў, індустрыялізацыі і электрыфікацыі с.-г. зямляўпарадкаваньня і мэліярацыі, плянаваганамічны сэктар і г. д.

Белсадгародсаюз трэба ліквідаваць, перадаўшы яго функцыі Калгасцэнтру і Белплавводсаюзу.

Пры раённых выканаўчых камітэтах трэба стварыць сэктары па сельскай гаспадарцы, заблясьпечыўшы іх спэцыялістамі па асноўных галінах работы для плянава-рэгулюючай і кантрольнай работы. Як правіла, у штаце кожнага РВК павінен быць агранам-арганізатар, жывёлавод, зямляўпарадчык, вэтдоктар і, у залежнасьці ад напрамку гаспадаркі раёну, — працаўнікі па вузкіх спэцыяльнасьцях: ільнаводы, сьвіваводы, садаводы і г. д.

Трэба забясьпечыць раёны спэцыялістымі па гідратэхніцы, культуртэхніцы і торфаздабываньні, улічыўшы абʼём разгортваньня мэліярацыйных мерапр

НЕ ЗАБЫВАЦЬ
пра ўборку ўраджаю ў індывідуальным сэктары

ПРАЦОУНЫ ЭНТУЗІЯЗМ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПАЛЕХ І ПРАВІЛЬНЫЯ УЗАЕМААДНОСІНЫ З ІНДЫВІДУАЛЬНЫМІ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІМІ ГАСПАДАРКАМІ ВЫКЛІКАЮЦЬ НОВУЮ ХВАЛЮ ПРЫЛІВУ, УЗМАЦНЯЮЦЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ, Б'ЮЦЬ ПА КУЛАЦТВЕ І ЯГО АГЕНТУРЫ

КАЛГАСЫ „ЭНГЕЛЬС" І „КАМІНТЭРН" КАНЧАЮЦЬ КАЛЕКТЫЎНУЮ УБОРКУ АЗІМЫХ

НА ЛІКВІДАЦЫЮ ВУЗКІХ МЕСЦ УБОРКІ

„Будзем сеяць разам"

Прыліў у калгасы „Расьсьвет-Пераможца" і імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі

ЖЛОБІН. (Брыгада «Зьвязды»). Калгас «Расьсьвет-Пераможца» аказвае вялікую дапамогу індывідуальным бядняцкім гаспадаркам па ўборцы ўраджаю. У сваіх плянах уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы калгас «Расьсьвет-Пераможца» прадугледжвае значную дапамогу машынамі і коньмі індывідуальнікам-беднякам і сераднякам Майскага сельсавету. Многія беднякі цяпер, у часе ўборкі, ня маюць хлеба і круп. Праўленьне калгасу з дазволу агульнага сходу калгасьнікаў дапамагае гэтым беднякам харчовымі прадуктамі. За першыя дні ўборкі ўжо 18 беднякоў і ўдоў атрымалі дапамогу ад калгасу.

«Расьсьвет-Пераможца» ў сваёй кузьні ўвесь час рамантаваў у парадку дапамогі с.-г. інвэнтар беднякам-індывідуальнікам. Кулацкія элемэнты, імкнучыся сарваць уборачную кампанію, два тыдні назад спалілі калгасную кузьню. Калгасьнікі не замяшаліся. Калектыўнымі намаганьнямі яны пабудавалі новую кузьню, у якой зараз рамантуюцца калёсы і сярпы беднякоў-індывідуальнікаў, а таксама і сераднякоў.

— Што-б мы рабілі, калі-б ня было калгасу, — гавораць індывідуальнікі, рамантаваць сярпы і калёсы ня было-б дзе. Гэта напэўна сарвала-б уборку.

Зараз праўленьне калгасу «Расьсьвет-Пераможца» наладжвае справаздачы аб посьпехах гаспадарчай дзейнасьці калгасу на агульных сходах індывідуальнікаў Майскага сельсавету.

Ня дзіва, што зараз у калгас уступаюць бядняцкія і серадняцкія індывідуальныя гаспадаркі. Суседняя вёска Дзяніскавічы, напрыклад, цалкам выказалася за ўступленьне ў калгас. Там зараз праводзіцца арганізацыйна-растлумачальная работа.

Калгас імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (Затокскі сельсавет) таксама арганізаваў дапамогу індывідуальным бядняцка-сераднякім гаспадаркам. У кузьні калгасу наладжаны рамонт с.-г. інвэнтару індывідуальнікаў. За апошні час калгас адрамантаваў дармова беднаце 87 калёс. Калгасная кузьня рамантуе плугі індывідуальнікам—беднякам і сераднякам (беднаце—дармова і адвастрыла ім каля 2.000 сярпоў. У вёсцы Праскурні калгас дармова ўбраў палоскі асобных беднякоў і ўдоў. Десяткі індывідуальнікаў беднякоў і малазаможных сераднякоў заяўляюць, што яны «будуць сеяць азімыя разам з калгасам». Нядаўна ў калгас імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ўступіла 11 новых гаспадарак.

Е. С.

За большавіцкую ўборку
Трактар з жняркай-снопавязалкай за работай у калгасе «Расьсьвет—Пераможца»

Злачынная марудносьць

Сяўбе пагражае зрыў

БРАГІН, 24. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). У БРАГІНСКІМ РАЁНЕ СТВАРЫЛІСЯ РЭАЛЬНАЯ ПАГРОЗА ЗРЫВУ АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ. У РАЁНЕ ЕСЬЦЬ 44 ПУНКТЫ, ДЗЕ ЯШЧЭ ТРЭБА ПРАВЕСЬЦІ ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

ПАКУЛЬ ШТО ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ ПРАВЕДЗЕНА ТОЛЬКІ У ДВУХ ПУНКТАХ. ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ ВОЛЬШ - МЕНШ СВАЯЧАСОВА МОЖА БЫЦЬ ПРАВЕДЗЕНА ТОЛЬКІ У ТЫМ ВЫПАДКУ, КАЛІ ЗАРАЗ-ЖА, НЯ ТРАДЫЧЫ НІ АДЗЭЙ ХВІЛІНЫ, 7 КАМОРНІКАЎ ПАЧНУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ З ПОЎНАЙ НАГРУЗКАЙ. МІЖ ТЫМ, У РАЁНЕ ПРАЦУЕ ТОЛЬКІ ДВА КАМОРНІКІ.

КАЛІ НЕАДКЛАДНА НЯ БУДУЦЬ ЎЖЫТЫ ТЭРМІНОВЫЯ І ЭНЭРГІЧНЫЯ МЕРЫ, ДЫК АСЕНЬНЯЯ СЯЎБА Ў БРАГІНСКІМ РАЁНЕ БУДЗЕ САРВАНА.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ» К—ў.

„ДАМО ХЛЕБ РАБОЧЫМ"

„Камінтэрн" канчае калектыўную ўборку азімых

ЧАЧЭРСК, 24. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ») Калгас «КАМІНТЭРН» з посьпехам канчае калектыўную ўборку азімых пасеваў. Ня гледзячы на вялікую нястачу рабочай сілы (не хапае 50 проц. патрэбнай рабочай сілы) калгасьнікі выходзяць пераможцамі. Уборка ўраджаю праходзіць дружна, з вялікім уздымам.

Вялікую сьвядомасьць праявілі жанчыны-калгасьніцы. Паводле іх прапановы работа на палёх ідзе таксама і ў сьвяточныя дні. Калгасьнікі праводзяць уборку пад лёзунгам — «ДАМО ХЛЕБ РАБОЧЫМ».

Калгас ужо ўбраў 60 гэкт. азімых пасеваў. Паводле аднадушнай пастановы агульнага сходу калгасу, уборка і абмалот азімых праводзіцца КАЛЕКТЫЎНА. Ураджай у калгасе «Камінтэрн» у некалькі раз вышэй, чым у індывідуальных бядняцкіх гаспадарках. Паміж калгасьнікамі і індывідуальнікамі — беднякамі ісераднякамі існуюць самыя добрыя адносіны. Беднякі індывідуальнікі амаль кожны дзень прыходзяць у калгас за рознай дапамогай, якую заўсёды атрымліваюць. Калгас ахвотна дапамагае беднаце сэзоньнем, машынамі, с.-г. інвэнтаром і г. д. Нядзіва, што вакольныя індывідуальнікі-беднякі, а таксама многія сераднякі заяўляюць:

— МЫ—БУДУЧЫЯ КАЛГАСЬНІКІ. ХУТКА ЎСЕ ЎСТУПІМ У ЧЛЕНЫ КАЛГАСУ «КАМІНТЭРН».

Раённыя арганізацыі невыстарчальна дапамагаюць калгасу «Камінтэрн». Райвыканком, напрыклад, абавязаўся скончыць да ўборачнай кампаніі будаўніцтва ясьляй у калгасе. Аднак, ясьлі ня скончаны і па сёньшні дзень. Райкалгасаюз на цэлы месяц спазьніўся з адводам сенажаці для калгасу. Нават і зараз калгас «Камінтэрн» з-за галавацяпства раённага Калгассаюзу НЯ МАЕ пэўных вучасткаў сенажаці.

Кулацкія элемэнты вядуць шалёную агітацыю супроць калгасу.

Аднак, усе спробы кулакоў сарваць уборку калгаснага ўраджаю канчаюцца КРАХАМ.

Фарбэраў.

Раніцою калгасьнікі з калгасу «Расьсьвет—Пераможца выяжджаюць ў поле для ўборкі ўраджаю

700 УДАРНІКАЎ НА ПАЛЁХ

Калгас „Энгельс" арганізаваў брыгадныя вытворчыя камісіі

ГОМЕЛЬ, 24. (Наш кар.). Калгас «Энгельс», Уваравіцкага раёну разгарнуў уборку ўраджаю. Уборачная кампанія ідзе поўным ходам. Апрача яравых пасеваў калгас навінен убраць 383 гэкт. жыта, сенажаці—400 гэкт.; вікі і канюшыны—100, усяго 883 гэкт.

Уся рабочая сіла калгасу разьбіта на 10 брыгад, якія аб'ядноўваюць 700 калгасьнікаў. Брыгады абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньні ўборкі. 6 брыгад накіраваны на ўборку жыта; 2—на ўборку сенажаці; 1—на нагляд за агародамі; 1—на поліва яравых пасеваў. Пры кожнай брыгадзе арганізавана брыгадная вытворчая камісія, якая вырашае пытаньні лепшага і хутчэйшага правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Калгас мае 6 аддзяленьняў і аб'ядноўвае 260 бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Уборка жыта праходзіць калектыўна. На полі працуюць 12 машын. Да 19-га ліпеня ўбрана звыш 100 гэкт. вікі і канюшыны. Паводле пляну, уборка ўраджаю павінна быць скончана да 5-га жніўня. Калгасьнікі ўпэўнены, што выканаюць плян раней тэрміну.

У калгасе арганізавана грамадзкая сталоўка, якая абслугоўвае 200 калгасьнікаў.

М.

Завезена толькі 50 сярпоў

Хто адкажа за галавацяпства

МАЗЫР, 24. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). УБОРАЧНАЯ КАМПАНІЯ Ў ЖЫТКАВІЦКІМ РАЁНЕ ЗРЫВАЕЦЦА З-ЗА ВЯЛІКАЙ НЯСТАЧЫ СЯРПОЎ, КОС І ІНШ. УБОРАЧНЫХ ПРЫЛАД. ПЛЯН ПРЫВОЗУ СЯРПОЎ І КОС У ЖЫТКАВІЦКІ РАЁН АМАЛЬ ПОЎНАСЬЦЮ САРВАНЫ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ У РАЁН ПРЫВЕЗЕНА ТОЛЬКІ... 50 СЯРПОЎ. КАЛГАСЫ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ, НЯ МАЮЦЬ ЧЫМ УБІРАЦЬ УРАДЖАЙ.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ» М—н.

У ЦІСКОХ БЯСПЛЯ НАВАСЬЦІ

Калгас імя 1 мая да ўборкі не гатоў

Ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ у адпачынку

ВІЦЕБСК. (Брыгада «Зьвязды»). Першыя дні ўборкі сенажаці і азімых паказваюць, што калгас імя 1 мая зусім не падрыхтаваны да ўборачнай кампаніі. У калгасе няма ніякай арганізацыі працы. Рабочая сіла не размеркавана па брыгадах і скарыстоўваецца бяз усякага пляну.

Ня дзіва, што ўборка ідзе недапушчальна марудным тэмпам. Звыш 8 тон скошанай сенажаці ня ўбраны і гніюць на дажджы. Праўленьне калгасу ня ўжыло ніякіх захадаў, каб не дапусьціць марнага псаваньня сенажаці.

Да гэтага часу калгас ня мае ніякіх плянаў і рабочых праграм уборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Мясцовы аграном ужо больш за два тыдні зьбіраецца скласьці плян і ніяк не зьбіраецца. Між тым, уборка ўраджаю, якая ўжо разгарнулася, ідзе самацёкам.

Аб зьдзельнай аплаце працы ў калгасе ніхто нічога ня ведае. Члены праўленьня калгасу на гэту тэму шмат гаварылі наміж сабой, але далей разважаньняў справа не пашла. Калгасьнікі не пераведзены на зьдзельную аплату працы.

Калгас поўнасьцю забясьпечаны машынамі за выключэньнем бульбакапалак. Аднак уборачныя машыны не скарыстоўваюцца. Жнівярка валяецца бяз усякай карысьці. Палявод калгасу заяўляе, што «жнівяркай убіраць ураджай нямэтазгодна, лепш рукамі, таней каштуе».

Працоўная дысцыпліна сярод калгасьнікаў слабая. Сацыялістычнае спаборніцтва зусім не разгорнута. Партыйная і камсамольская ячэйкі не рэагуюць на гэтыя факты. Асобныя камсамольцы ў часе ўборкі скампраметавалі сябе, як нікуды ня вартыя і дрэнныя работнікі. Камсамолец—загадчык аддзяленьня калгасу даўно даручанае яму аддзяленьне да фактычнага развалу. У калгасе заўважваюцца прагулы. Асобныя калгасьнікі зусім ня выходзяць на ўборачныя работы.

У самы разгар уборачнай кампаніі сак ратар партыйнай ячэйкі бяз ведама і дазволу ячэйкі пайшоў у адпачынак. Ячэйка засталася без кіраўніцтва. Старшыня калгасу ў дні ўборачнай кампаніі амаль ня бывае ў калгасе і ўвесь час разьязджае па камандыроўках, або бывае ў горадзе. Так далей быць ня можа.

ФРОЛАЎ.

Пакончыць з бясплянавасьцю і безадказнасьцю ў рабочым забесьпячэньні

(На пасяджэньні бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б)

На бюро ФРУНЗАЎСКАГА райкому КП(б)Б стаяла пытаньне аб рабочым забесьпячэньні. Бюро адзначыла рад недахопаў у рабочым забесьпячэньні на прадпрыемствах Фрунзаўскага раёну. Гэтыя недахопы стварыліся з-за нядбайных адносін ЦРК да справы бесьперабойна-плянавага забесьпячэньня заводзкіх сталовак і буфэтаў прадуктамі. Бясплянавасьць у забесьпячэньні спрыяе перабоям забесьпячэньня і росту чэргаў. Напрыклад, у буфэце 1-й дзяржфрукарні часам няма ніякіх прадуктаў у той час, калі ў іншых буфэтах прадукты застаюцца на другі дзень.

Буфэты не загатаўляюць загадзя прадуктаў, каб у часе абедзеннага перапынку не стваралася вялікая чарга. З прычыны малога штату ў буфэтах, апошнія не спраўляюцца абслугоўваць рабочых. Рабочым часта прыходзіцца прастаяць у чарзе ўвесь абедзенны перапынак з прычыны чаго павялічваюцца прагулы і спазьненьні на работу.

Побач з гэтым ёсьць факты проста напляваўцельскіх адносін да рабочых з боку абслугоўваючага пэрсаналу. Напрыклад, на заводзе «Камунар» былі выпадкі, калі рабочаму падавалі сырую страву, пасьля якой ён некалькі дзён хварэў. Загадчык буфэту таго-ж заводу беспадстаўна падвышае цану яек з 80 кап. да 1 р. 15 к. за дзесятак. ЦРК яшчэ ня здолеў арганізаваць своячасовай падвозкі прадуктаў у буфэты і сталоўкі.—Часта прадукты прывозяцца ў часе абедзеннага перапынку, калі ў буфэтах вялікая чарга. Адзіны працаўнік буфэту замест выдачы абедаў рабочым, прымае прыведзеныя прадукты.

Яшчэ горш абстаіць справа з забесьпячэньнем сэзоньнікаў. 500 сэзоньнікаў, якія працуюць на Ляхаўцы, не прымацаваны ні да аднэй сталоўкі.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб няўважлівых, нядбайных адносінах МЦРК да справы рабочага забесьпячэньня.

Бюро райкому адзначыла, што ў гэтай справе патрэбен рашучы пералом і вызначыла наступныя мерапрыемствы:

— Правесьці сярод рабочых растлумачальную работу аб харчовых цяжкасьцях;

— Прапанаваць ЦРК неадкладна палепшыць якасьць абедаў;

— Устанавіць рэгулярнае наведваньне сталовых інструктарамі ЦРК;

— Забясьпечыць другую і трэцюю зьмену, а таксама і сэзоньнікаў прадуктамі;

— Паставіць перад адпаведнымі органамі пытаньне аб паскоранай выпрацоўцы тэрмасаў, каб даць магчымасьць забясьпечыць абедамі тыя фабрыкі, на якіх няма сталовак;

— Прапанаваць ЦРК увесьці абанэмэнтную сыстэму, каб у часе абедаў ня было грашовых разьлікаў і чэргаў ля кас.

— Абсталяваць сталоўку для рабочых 1-й дзяржфрукарні;

— Паставіць пытаньне перад акругкомам партыі аб уключэньні будаўніцтва сталовак у першую чэргу;

— Прыцягваць да судовай адказнасьці работнікаў ЦРК, якія беспадстаўна павышаюць цэны;

— ЦРК павінен палепшыць свой транспарт, а гаспадарчыя арганізацыі—дапамагчы сваім транспартам дастаўцы абедаў;

— ЦРК павінен рацыяналізаваць свой апарат, каб можна было на часы абедзеннага перапынку перакінуць частку работнікаў крам ЦРК у рабочыя сталоўкі.

Гэтыя мерапрыемствы павінны дапамагчы паляпшэньню рабочага забесьпячэньня.

Я. Д.

***

Наш друк сыстэматычна завастраў увагу на пытаньнях рабочага забесьпячэньня, у прыватнасьці па рабоце МЦРК па абслугоўваньні рабочага спажыўца.

У друку падкрэсьлівалася, што МЦРК не перабудаваў сваёй работы ў кірунку лепшага абслугоўваньня пайшчыкаў, што ў грамадзкім харчаваньні ёсьць шмат недахопаў, што МЦРК павінен дабіцца рашучага пералому ў забесьпячэньні рабочага насельніцтва.

Цяпер МЦРК прыняў некаторыя меры, каб выканаць запатрабаваньні савецкай грамадзкасьці, каб палепшыць рабочае забесьпячэньне.

У прыватнасьці, нядаўна у мэтах рацыяналізацыі водпуску дроў, МЦРК спыніў выдачу дроў індывідуальным спажыўцам і цяпер адпускае дровы толькі рабочым калектывам.

Прыняты некаторыя меры і для зьніжэньня чаргі ў рабочых сталоўках. Праўленьне МЦРК пастанавіла з 5-га жніўня прымацаваць рабочых і служачых да асобных сталовак.

Да сталовак будзе прымацавана каля 20 тыс. чалавек. Рабочыя будуць прымацаваны ў першую чаргу да сваіх заводзкіх сталовак. 10 проц. абедаў будзе адпускацца рабочым сем'ям на дом. Асобы, якія будуць харчавацца ў сталоўцы, павінны будуць аддаць сталоўкам свае каапэрацыйныя кніжкі. Уводзяцца спэцыяльныя карткі-абанамэнты для абедаючых.

Трэба, каб МЦРК свае мерапрыемствы на паляпшэньні рабочага забесьпячэньня раней абгаварваў на рабочых сходах, каб самі пайшчыкі маглі ўнесьці патрэбныя папраўкі.

На барацьбу за прамфінплян

Прарыў у скуранаабутковай прамысловасьці не ліквідаваны

ЖНІВЕНЬ МЕСЯЦ БУДЗЕ РАШАЮЧЫМ

Гарбары, абутнікі, заводзкія арганізацыі! мабілізуйце ўсе сілы на ліквідацыю прарыву

Скуранаабуткорая прамысловасьць адыгрывае зараз вялікую ролю ў рабочым забесьпячэньні. Недахват абутку адбіваецца адмоўна ня толькі на забесьпячэньні насельніцтва, але і на забесьпячэньні рабочых і сэзоньнікаў спец абуткам, што тармозіць разгортваньне іншых галін прамысловасьці. Таму недавыкананьне вытворчай праграмы Белскураб'яднаньнем балюча б'е па інтарэсах усёй нашай прамысловасьці і рабочага спажыўца.

343 тысячы пар абутку, якіх ня выпрацавала абутковая прамысловасьць, далі-б магчымасьць забясьпечыць усіх прамысловых рабочых разам з іх сем'ямі абуткам амаль на цэлы год. Вось які прарыў мае скуранаабутковая прамысловасьць у выніку 9 месяцаў работы.

Хто-ж у гэтым больш вінаваты?

Гарбарня «Бальшавік» выканала вытворчую праграму на 101,3 проц., віцебская гарбарня—на 104,3 проц., магілеўская—на 103,6 проц. і гомельская гарбарня—на 103,6 проц. Усе гарбарні разам выканалі сваю праграму на 102,9 проц.

Такім чынам выпрацоўка сырцу для абутковых фабрык беларускімі прадпрыемствамі ішла ў разьмерах, прадугледжаных плянам.

Але вось абутковыя фабрыкі працавалі зусім дрэнна. Горш за ўсіх працавала гомельская абутковая фабрыка, якая выканала сваю вытворчую праграму за 9 месяцаў на 64 проц. Крыху лепш за яе працавала віцебская абутковая фабрыка, якая выканала 86,9 проц. праграмы. Лепш за іх працавала менская фабрыка, якая дала 93,5 проц. праграмы. Усе тры фабрыкі разам ня выпрацавалі звыш 15 проц. усёй праграмы абутковай прамысловасьці. Вось вінаватыя ў тым, што органы забесьпячэньня не атрымалі каля 350 тысяч пар абутку.

Чэрвень месяц у рабоце менскай абутковай фабрыкі быў пераломным. За гэты месяц фабрыка выканала праграму на 100,6 проц. Але ніякага пералому яшчэ ня відаць на віцебскай абутковай фабрыцы, якая ў чэрвені выканала праграму на 89,5 проц., і на гомельскай абутковай фабрыцы, якая выканала ўсяго праграму на 27,4 проц. Праўда, Гомельская фабрыка ў чэрвені працавала толькі 10 дзён, у сувязі з адпускным пэрыядам. Але і праграму гэтых 10 дзён фабрыка выканала толькі на 60 проц.

Прарыў на абутковых фабрыках можа быць ліквідаваны толькі пры максымальным напружаньні ўсіх сіл рабочых калектываў і заводзкіх арганізацый. Час, які застаўся да канца гаспадарчага году, трэба скарыстаць для максымальнай мабілізацыі мас і зьніжэньня недахопаў у рабоце цэхаў.

Ліквідацыяй прарываў у колькасных паказальніках не абмяжоўваецца задача абутнікаў. Дрэнна стаіць справа таксама з выкананьнем заданьня па зьніжэньні сабекошту. Толькі адна магілеўская гарбарня перавыканала заданьне па зьніжэньні сабекошту на 2,08 проц. (замест 4 проц.—6,08 проц.). Гарбарня «Бальшавік» зьнізіла сабекошт на 7,68 проц. замест 11 паводле пляну; віцебская гарбарня зьнізіла сабекошт на 0,51 проц. замест 8 проц. паводле пляну, а гомельская гарбарня павысіла сабекошт на 0,73 проц. замест зьніжэньня яго на 5 проц.

Менская абутковая фабрыка зьнізіла сабекошт на 5,08 проц., замест 9,7 проц., віцебская—на 10,24 проц. замест 11,7 проц. і гомельская абутковая фабрыка зьнізіла на 3,22 проц. замест 20 проц. паводле пляну. Такім чынам, на гомельскай абутковай фабрыцы выначаецца найбольшы прарыў як у колькасных паказальніках, так і ў выкананьні заданьня па зьніжэньні сабекошту. Разам па скураб'яднаньні сабекошт зьніжаны па 5,9 проц. замест 12 проц. паводле пляну.

Кожны процант зьніжэньня сабекошту складае сотні тысяч рублёў і невыкананьне заданьня больш чым на палову пазбаўляе магчымасьці Белскураб'яднаньне выканаць свае пляны капітальнага будаўніцтва. Таму ліквідацыя прарыву ў якасных паказальніках таксама зьяўляецца вельмі важнай і неабходнай задачай усіх рабочых скуранаабутковай прамысловасьці і яе кіраўнікоў.

Змагаючыся за ліквідацыю прарываў, гарбары і абутнікі павінны даць рашучы адпор усім апартуністычным элемэнтам, якія лічаць немагчымым у такі кароткі тэрмін, што застаўся да канца гаспадарчага году, ліквідаваць прарывы. Рабочая кляса Савецкага Саюзу спраўляецца з большымі труднасьцямі на шляху будаўніцтва сацыялізму і паасобныя атрады рабочае клясы, сапраўды адданыя інтарэсам індустрыялізацыі краю, пры належнай ініцыятыве і імкненьні здольны будуць перамагчы ўсе труднасьці і дабіцца выкананьня дырэктывы партыі, выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

П.

Пазыка „Пяцігодка за чатыры гады"

НЕ РАЗЬЛІЧВАЦЬ на САМАЦЕК!

Разгарнуць энэргічную растлумачальна-агітацыйную кампанію.—Шырокай растлумачальнай работай дабіцца ахопу пазыкай двухтыднёвага заработку 100 проц. рабочых і служачых

Першы выклік з вёскі

Асобныя сельсаветы Жлобінскага раёну, не чакаючы дырэктыў вышэйшых органаў аб рэалізацыі пазыкі «5-пігодка—за чатыры гады», горача прыняліся за датэрміновую падпіску. Перщым у раёне распачаў падпіску Майскі сельсавет, які за адзін дзень па пленуме сельсавету сабраў падпіскі на 305 руб. Падпісаліся ўсе члены сельсавету.

Майскі сельсавет пастанавіў выклікаць на сацспаборніцтва па рэалізацыі пазыкі іншыя сельсаветы раёну.

На выклік Майскага сельсавету першым адгукнуўся Затонскі сельсавет, які сабраў падпіску на 220 руб.

Зараз у раёне праведзена мабілізацыя раённага актыву для рэалізацыі пазыкі ў вёсках. Кампанія разгортваецца.

Е. С.

Па тэлефону 13-80 з заводаў

На 25-га ліпеня па бровары «Беларусь» з 180 рабочых падпісалася 165 па суму 4,500 руб. пры двухтыднёвым фондзе зарплаты ў 6.000 рублёў.

Такім чынам, пазыкай ахоплена 90 проц. рабочых на 75 проц. двухтыднёвага фонду зарплаты.

На дражджавым заводзе «Чырвоная Зара» папярэдняя падпіска ахапіла 90 проц. рабочых, якія поўнасьцю падпісаліся на двухтыднёвы заработак.

Члены цукерзавай арцелі «Перамога» ў ліку 60 чалавек з 64-х, падпісаліся на поўную месячную заработную плату. Члены арцелі выклікалі на спаборніцтва ўсе арцелі Менсампрамсаюзу.

У Пухавіцкім раёне рэалізацыя праводзіцца без падрыхтоўкі

Гэтымі днямі Менская акруговая камісія садзейнасьці праверыла, як падрыхтаваліся да правядзеньня кампаніі рэалізацыі пазыкі Пухавіцкі РВК, крэдытныя ўстановы і раённая камісія садзейнасьці. Абсьледваньне выявіла, што, ня гледзячы на тое, што асноўныя агітацыйныя матар'ялы былі атрыманы яшчэ да афіцыйнага пачатку кампаніі, ашчадкаса і райсельбанк ня прынялі ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да кампаніі. Наперакор дырэктывам, кантрольныя лічбы даведзены да асобных калгасаў і дробных устаноў.

Ашчадкаса і райсельбанк лічылі, што рэалізацыя пазыкі гэта справа райвыканкому, а не крэдытных устаноў.

Трэба адзначыць, што па раёне ёсьць вялікая запазычанасьць і па 3-й пазыцы індустрыялізацыі.

Нічога ня зроблена для абмену аблігацый 1-й і 2-й пазык на аблігацыі новай пазыкі.

Ва многім вінавата тут кіраўніцтва ашчадным касамі Менскай акругі і Белкантора Дзяржбанку, якія не зьвяртаюць увагі на работу сваіх нізавых зьвяньняў.

Б—н.

Стаўка апартуністых разьбіта

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). 4 беспартыйныя рабочыя 1-й зьмены шчапальнага цэху фабрыкі «Пралетарская Перамога» зьявіліся першымі падпісчыкамі ў цэху на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады». Заробляючы па 60 руб. у месяц, яны запісаліся на месячны аклад і выклікалі пасьледваць свайму прыкладу сяброў-рабочых.

Яшчэ да сходу, на якім быў пастаўлены даклад аб пазыцы, падпісалася па 1-й зьмене 36 рабочых на 1.800 руб.

Зараз пазыкай ахоплена 70% ўсіх рабочых на суму, якая перавышае двухтыднёвы заработак.

Разьбітай аказалася стаўка правых апартуністых, якія прадракалі, што рабочыя не падпішуцца на гэту пазыку, што ўстанаўленьне грамадзкага кантролю падарве давер'е да пазыкі.

РАБОЧЫ.

СПАБОРНІЦТВА МЭДЫЧНЫХ РАБОТНІКАЎ

ВОРША. (Наш кар.). У мэдычных установах гораду шырока разгарнулася падпіска на пазыку. Установы спаборнічаюць паміж сабой на найбольшы разьмер падпісні, на найбольшы ахоп служачых.

У калектыве рабочай амбуляторыі падпісалася 28 працаўнікоў—70 проц. агульнага ліку на 2.050 руб. Шмат дактароў падпісалася на 100-130 проц. месячнай зарплаты.

Прафактыў больніцы імя Сямашкі ў адзін дзень падпісаўся на 900 руб., з іх каля 30% падпісалася на поўны месячны аклад. Доктар Шабунін набыў аблігацый на 250 руб.

Аптэчныя працаўнікі на агульным сходзе аднагалосна пастанавілі падпісацца на двухтыднёвы заработак.

Бюлетэнь—для нізавых камісій садзейнасьці

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкредыту і НКФ Саюзу ССР выпусьцілі спэцыяльны бюлетэнь па дзяржкредыту пад назвай «Працоўныя зьберажэньні на сацыялістычную будоўлю». Гэты бюлетэнь павінен абслужыць нізавыя камісіі садзейнасьці, даваць інфармацыйны і інструкцыйны матар'ял па пытаньнях правядзеньня кампаніі, грамадзкага кантролю над аблігацыямі, абмену пазык і г. д.

Камісіі садзейнасьці павінны прыняць меры да атрыманьня гэтага бюлетэню, які прыняце вялікую карысьць нізавым працаўнікам дзяржкредыту.

Апрача таго, фінансавыя органы і камісіі садзейнасьці павінны стварыць спэцыяльны кадр рабкораў з працаўнікоў крэдытных органаў і камісій садзейнасьці для асьвятленьня ў «Бюлетэні» работы на мясцох і арганізацыі абмену думкамі. Першы нумар бюлетэню ўжо выйшаў і разьмеркаваны паміж камісіямі садзейнасьці. Бюлетэнь будзе выходзіць рэгулярна кожныя 10 дзён.

В. І.

Не здаваць заваяваных пазыцый!

Менская швэйная фабрыка «Кастрычнік» увесь час добра спраўляецца са сваімі задачамі. Нават у першым квартале, які адзначыўся на большасьці прадпрыемстваў прарывамі, фабрыка «Кастрычнік» перавыканала сваю вытворчую праграму на 5,9 проц. і амаль выканала якасныя паказальнікі: прадукцыйнасьць працы замест 42 проц. узьнята на 37,9 проц., а сабекошт замест 10 проц. зьніжаны на 8 проц.

У другім квартале колькасны паказальнік быў перавыкананы усяго на 0,92 проц., затое якасныя паказальнікі былі значна перавыкананы: прадукцыйнасьць працы на 1,2 проц., а сабекошт зьніжаны на 17,2 проц. замест 13,9 проц. паводле прамфінпляну.

Трэці квартал прынёс фабрыцы перамогу па ўсім фронце: вытворчая праграма перавыканана на 38,5 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 60 проц. замест 42 проц. паводле пляну, сабекошт зьніжаны на 19,01 проц. замест 13,9 проц. паводле пляну.

За 9 месяцаў фабрыка «Кастрычнік» мае наступныя дасягненьні: праграма перавыканана на 11,36 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 45,6 проц. замест 42 проц. паводле пляну, сабекошт зьніжаны на 14,8 проц. замест 12,72 проц. паводле пляну. Гэтымі дасягненьнямі рабочыя фабрыкі маюць поўнае права ганарыцца. Фабрыка апраўдала давер'е рэдакцыі газэты «Зьвязда», якая яшчэ ў другім квартале занесла яе НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ.

Але пачатак 4-га кварталу выначыўся на фабрыцы невыкананьнем вытворчай праграмы. За першыя дзьве дэкады ліпеня праграма выканана НА 96,39 ПРОЦ. Тлумачыцца гэта тым, што фабрыка з 26 чэрвеня перайшла на выпрацоўку зімовай вопраткі. Новы від работы, зразумела, зьнізіў тэмпы работы агрыгатаў.

Чацьверты квартал — рашаючы для ацэнкі работы прадпрыемства. Рабочы калектыў фабрыкі «Кастрычнік» павінен напружыць усе сілы, каб не здаць, заваяваных ва ўпартым змаганьні за прамфінплян, пазыцый. Трэба хутчэй ліквідаваць адставаньне першага месяца 4-га кварталу, каб утрымаць пічбы работы 9 месяцаў на тым-жа ўзроўні.

В—н.

Сталярны цэх адстае

Завод «Дрэваапрацоўшчык» у бягучым гаспадарчым годзе перажыў некалькі цяжкіх пэрыядаў. Асабліва цяжка было заводу ў пачатку трэцяга кварталу, калі выявілася, што лесапільны цэх за другі квартал недавыканаў праграмы на 5,34 проц., а сталярны цэх на 24,44 проц. Аб прычынах не давыкананьня праграмы шмат пісалася. Невыстарчальнае кіраўніцтва з боку адміністрацыі, слабое разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, затрыманьне пуску другой зьмены сталярнага цэху,—усё гэта адаўна адбілася на выкананьні прамфінпляну.

Зьмена кіраўніцтва, пуск другой зьмены сталярнага цэху, пераход на бесьперапынны тыдзень, мабілізацыя ўвагі рабочых на ліквідацыю прарываў,—дапамаглі заводу наблізіцца да выкананьня плянавых заданьняў.

У выніку 9 месяцаў работы лесапільны цэх перавыканаў праграму на 0,65 проц., а сталярны цэх недавыканаў яе на 6,19 проц. Такім чынам, і зараз сталярны цэх, з прычыны вялікага прарыву ў другім квартале, ня выканаў цалкам абавязкаў, якія ўсклаў на яго прамфінплян.

Але ёсьць надзея, што да канца гаспадарчага году сталярны цэх ліквідуе прарыў поўнасьцю. Ужо ў трэцім квартале ён перавыканаў праграму на 5,92 проц. Зараз у цэху праводзіцца рамонт, які павінен яшчэ больш павялічыць яго прадукцыйнасьць.

Рабочым «Дрэваапрацоўшчыку» не павінны забываць, што да канца гаспадарчага году засталося вельмі мала часу.

П.

Прыкладная фабрыка

Адзін з першых кандыдатаў на чырвоную дошку

Шпалерная фабрыка імя Вароўскага можа служыць прыкладам для многіх нашых прадпрыемстваў. Недавыканаўшы ў першым квартале вытворчую праграму на 3,4 проц. і заданьне на ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы на 17,17 проц. (замест 42 проц. прадукцыйнасьць працы была ўзьнята толькі на 24,83 проц.), фабрыка хутка перабудавалася ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі прамфінпляну. Дзякуючы рацыяналізацыі вытворчасьці, якая была праведзена перадавымі рабочымі пад кіраўніцтвам адміністрацыі і фабрычных арганізацый, фабрыка здолела ня толькі ліквідаваць прарыў, але і дабіцца вялікіх перамог на фронце выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Ужо ў другім квартале вытворчая праграма была выканана на 108,9 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 59,77 проц. замест 42 проц. паводле пляну і сабекошт зьніжаны на 17,3 проц. замест 10,9 проц.

У трэцім квартале праграма была выканана на 104,1 проц.,

Да Міжнароднага Чырвонага Дня

Пад знакам баявога інтэрнацыяналізму

Кітайскія рэвалюцыянэры на мопраўскім вечары

22-га ліпеня, у клюбе акрыканкому адбыўся масавы мопраўскі інтэрнацыянальны вечар, прысьвечаны Міжнароднаму Чырвонаму Дню і прыезду дэлегацыі кітайскіх рэвалюцыянэраў.

З дакладам аб МЧД выступіў старшыня Мен. АК МОПР'у. Дакладчык спыніўся на фактах, якія сьведчаць аб узмоцненым узбраеньні імпэрыялістых і аб падрыхтоўцы да вайны. Асабліва ліхаманкавая падрыхтоўка да вайны вядзецца ў Польшчы, дзе выгружаюцца дасяткі параходаў з Францыі і Бэльгіі з танкамі, газамётамі і бомбамі для самалётаў, а таксама дзе выгружаецца вялікая колькасьць зброі і вайсковай амуніцыі. У Польшчу прыбываюць групы францускіх і бэльгійскіх афіцэраў для кіраўніцтва новымі заводамі, дзе вырабляецца зброя.

Адначасова, з узмацненьнем узбраеньняў пры актыўнай дапамозе сацыял-фашыстых, адбываецца і фашызацыя буржуазных краёў. Фашысцкія арганізацыі ў Італіі налічваюць **600 тыс.** чалавек, у Амэрыцы ў фашысцкай арганізацыі Ку-Клус-Кан налічваецца **2 млн. чал.**, у Нямеччыне «Сталёвы шлём» **—4 млн.**, у Фінляндыі «Шуцкоры»—**140 тыс. чал.**, у Эстоніі «Кайцэліт»—**30 тыс. чал.**, у Латвіі «Айсаргі»—**35 тыс. чал.**, у Польшчы «Стрэлец» «Саюз легіянэраў», Легіён польскай рэспублікі» і г. д.—налічваюць звыш—**1.500 тыс. чал.** Фашызм пры актыўнай дапамозе з боку сацыял-фашыстых—гэтых паймітаў і лёкаяў буржуазіі распраўляецца з рэвалюцыйнымі рабочымі. Бесьцэрапэтным белым тэрорам капіталістыя хочуць ачысьціць тыл для нападу на СССР. Але фашысцкі крывавы тэрор ня ў сілах спыніць рэвалюцыйны рух у капіталістычных краінах і калёніях. Рэвалюцыйны рух з кожным днём пашыраецца, узьнімаецца ўсё вышэй і вышэй, захапляе ўсё новыя пласты рабочае клясы, працоўнага сялянства і салдацкія масы буржуазных армій. **Растуць антываенныя настроі сярод салдат. Зараз у Францыі адбываецца працэс 22 салдат па абвінавачаньні ў мецяжы ў Румыніі з-за немаданьня быць гарматным мясам для буржуазіі, апошніх засуджаюць на пажыцьцёвую катаргу. У Польшчы салдаты адмовіліся разагнаць дэманстрацыі бастуючых рабочых у Дамброўскім раёне.** Жанчыны ў Лодзі дэманстравалі супроць мабілізацыі. І так, ва ўсіх капіталістычных краёх адбываецца вялізарны антываенны рух.

Мірная палітыка СССР і вялікае сацыялістычнае будаўніцтва яшчэ больш рэвалюцыянізуе працоўных усяго сьвету і прыводзіць у паніку капіталістых.

Задача мопраўцаў навінна быць накіравана на ўзмацненьне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, усямернага садзейнічаньня ў абароназдольнасьці краіны і баяздольнасьці Чырвонай арміі, быць у першых радох па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодку—за чатыры гады» і вышэй узьнець сьцяг інтэрнацыяналізму.

Пасьля дакладу, выступілі прадстаўнікі кітайскай камчартыі і камсамолу.

Т. Фралоў (удзельнік шанхайскага паўстаньня), **Мёдаў, Аксакаў і Басістава**—усе яны вітаюць мопраўцаў ад імя кітайскай камчартыі, камсамолу, рабочых і сялян. Яны расказваюць аб становішчы кітайскіх рабочых і сялян, дзе яны пазбаўлены ўсяляких правоў. Ад рук крывавага ката Чан-Кай-Шы гінуць сотні тысяч лепшых нашых братоў—кітайскіх рэвалюцыянэраў. Яны таксама перадаюць аб прычынах часовага паражэньня кітайскай рэвалюцыі.

Аднак, ня гледзячы на шалёны тэрор, рэвалюцыйны рух у Кітаі з кожным днём усё больш і больш узмацняецца. **У 22 правінцыях Кітаю арганізаваны саветы. Маюцца некалькі карпусоў кітайскай Чырвонай арміі.** Растуць рады кітайскага камсамолу і піянэраў. **Мы спадзяемся, што недалёк той час, калі ва ўсім Кітаі будзе савецкая ўлада.**

Тав. **Ахаманаў**—кіраўнік і перакладчык кітайскай дэлегацыі, былы член ЦВК БССР вітае мопраўцаў з 10-гі годзьдзем вызваленьня Беларусі ад белапалякаў і заклікае да ўзмацненьня тэмпаў сацбудаўніцтва і замацаваньня дасягнутых посьпехаў у БССР ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Рабочыя г. Менску прыслалі сваіх прадстаўнікоў вітаць кітайскую дэлегацыю. Ад чыгуначнікаў МБВ выступіў т. **Гілевіч**, ад галянтарэйнай ф-кі «Беларуска» т. **Готнік**; ад цукеркавай ф-кі «Комунаркай работніца **Райхельсон**. Яны ў сваіх выступленьнях запэўніваюць кітайскую дэлегацыю ў тым, што працоўныя г. Менску ўсе свае сілы прыкладуць для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну і яшчэ больш будуць узмацняць баяздольнасьць Чырвонай арміі.

Аб становішчы рабочае клясы і прыгнечаных народаў у Амэрыцы выступіў на ангельскай мове амэрыканскі рабочы—будаўнік т. **Голбэр.** Ён вітае мопраўцаў і кітайскую дэлегацыю ад амэрыканскай камчартыі і ўсіх рабочых Амэрыкі. Ён апавядае аб жорсткай эксплёатацыі рабочых у Амэрыцы, аб лінчаваньні неграў і аб забойстве 2-х рабочых у часе забастоўкі тэкстыльшчыкаў у Гастоніі. Тав. Голбэр гаворыць—**«я шчасьлівы, што жыву ў СССР —у сваёй бацькаўшчыне і прымаю ўдзел у вялікім сацыялістычным будаўніцтве».**

Замест рэзалюцыі мопраўцы паслалі прывітаньне кітайскім рабочым і сялянам, кітайскай Чырвонай арміі і савецкаму ўраду 22-х правінцый Кітаю.

Адначасова прымаецца пастанова **аб падпісцы на пазыку «пяцігодка за чатыры гады» на 10 тыс. руб. і гэтыя аблігацыі перадаць, як падарунак палітьня воленым падшэфных турмаў.**

Мопраўцы таксама пастанавілі далучыцца да пратесту піянэрскіх арганізацый супроць недапушчэньня савецкай піянэрскай дэлегацыі на міжнародны зьлёт піянэраў у Нямеччыне.

Вечар скончыўся дружным сьпевам Інтэрнацыяналу.

Забесьпячэньне гарадоў дровамі

Прэзыдыум АВК адзначыў нядбайныя і безадказныя адносіны Лесбелу і Саюзлесу да забесьпячэньня дровамі гарадоў Менскай акругі.

Менскаму гарсавету, органам РСІ, з прыцягненьнем грамадзкасьці, даручана ў тэрміновым парадку праверыць прычыны дрэннага забесьпячэньня дровамі гарадоў акругі, з тым, каб вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Прэзыдум таксама канстатаваў, што акрэндаль ня ўжыў мер да правераі завозу дроў і аб гэтых ненармальнасьцях не паведаміў прэзыдыум АВК.

Прэзыдыум АВК падтрымаў хадайніцтва Саюзлесу перад СНК БССР аб правядзеньні месячніку па вывазцы дроў.

Да 1-га ўсебеларускага зьезду горнарабочых

Тэмпы разьвіцьця маладой тарфяной і горнай прамысловасьці БССР, паводле пяцігадовага пляну, не адстаюць ад тэмпаў разьвіцьця нашай прамысловасьці і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Аб гэтым гаворыць наступныя лічбы.

У 1929-30 годзе было здабыта торфу 325.000 тон. Паводле пляну на 1930-31 год, павінна быць здабыта 923.000 тон.

Капітальныя ўкладаньні ў 1929-30 годзе складалі 5.274.000 руб., паводле-ж пляну на 1930-31 год—18 мільёнаў руб.

Рабочая сіла на нашых торфараспрацоўках і па фасфарытных заводах раўнялася ў 1929-30 годзе 6.960 чал., паводле пляну на 1930-31 год—22.500 чал. У мінулым годзе здабыта 10.660 тон фас фарытнай руды, у гэтым годзе павінна быць здабыта 60.000 тон.

Гэты магутны рост тарфяной і горнай прамысловасьці выклікаў неабходнасьць стварэньня пастаянных кадраў рабочых-тарфяньнікаў у БССР, іх клясавага і вытворчага выхаваньня, паставіў задачу стварэньня неабходных тэхнічных кадраў, задачу арганізацыі шырокіх рабочых мас для непасрэднага ўдзелу ў будаўніцтве горнай прамысловасьці.

Усё гэта патрабавала арганізацыі ў Беларусі саюзу горнарабочых. Зьезд саюзу горнарабочых БССР, які ўчора адчыніўся ў Менску, зьяўляецца першым зьездам маладой прафесыянальнай арганізацыі.

З чым прышоў саюз да свайго першага зьезду?

З прарывам на фронце здабычы торфу, з асобнымі прарывамі ў выкананьні праграмы размолу фасфарытнай руды.

Прафінплян па торфе на 10-е ліпеня выкананы толькі на 42 проц. Плян фасфарытнага размолу на Крыўскім заводзе на 1-е ліпеня выкананы толькі на 11 проц.

Дзе-ж прычыны прарыву?

Белторфаб'яднаньне і Наркампрацы не змаглі сваячасова забясьпечыць торфазаводы рабочай сілай. Торфаб'яднаньне ня здолела падрыхтаваць машыны і арматуру да сэзону. Заводы нявыканалі заказаў на машыны і абсталяваньне.

Ні гаспадарчая, ні прафесыянальная арганізацыя не змаглі падрыхтаваць патрэбных кадраў кваліфікаванай рабочай сілы.

Кулацтва зрывала вярбоўку рабочай сілы, варожы элемэнт пралязаў на асобных торфазаводах у рады рабочых і імкнуўся сарваць плян здабычы торфу.

Толькі дзякуючы мерам, якія былі сваячасова ўжыты з боку кіруючых партыйных і саюзных органаў, шырокія рабочыя масы торфараспрацовак, былі мабілізаваны на выкананьне прамфінпляну.

У мэтах выкананьня прамфінпляну па торфе, сэзон прадоўжаны да 25-га жніўня.

Усебеларускі зьезд горнарабочых павінен **мабілізаваць усіх рабочых торфараспрацован на задачу выкананьня прамфінпляну. Зьезд павінен вырашыць пытаньне аб стварэньні пастаянных кадраў рабочых тарфяньнікаў. Зьезд павінен пераключыць усю саюзную работу на новыя мэтады і формы.**

О. Г.

Пералому ў мясазагатоўках яшчэ няма

Злачынна-безадказная работа месц зрывае выкананьне заданьня

Тэлеграма ЦК КП(б)Б ад 19-га ліпеня зусім выразна паставіла перад усімі партыйнымі, савецкімі, каапэрацыйнымі і гаспадарчымі арганізацыямі пытаньне аб 100-процантным выкананьні плянаў загатовак буйной рагатай жывёлы ў ліпені. Поўнае выкананьне мясазагатовак у ліпені ЦК паставіў, як **баявую задачу.**

Між тым лічбы аб ходзе загатовак на 20-е ліпеня вельмі сумныя. Не адстае адна толькі **Бабруйская округа;** ступень выкананьня загатовак па іншых округах ні ў якім разе ня можа нас задаволіць.

На 20-е ліпеня Магілеўская округа выканала 30,3 проц. пляну, Менская —25,7 проц., Мазырская—24,5 проц., Віцебская—22,6 проц., Гомельская—22,5 проц., Аршанская—9,6 проц., Полацкая—8,3 проц.

Яшчэ горш абстаіць справа са зьняцьцем жывёлы з кантрактацыі. Процант выкананьня на 20-е ліпеня зусім мізэрны: па маладняку зьнята з кантрактацыі—1,7 проц., па буйной рагатай жывёле—3,4 проц., па сьвінях—3,5 проц. Тут мы маем ня толькі зрыў рабочага забесьпячэньня, але яшчэ горш—зрыў камплектаваньня стаду саўгасаў і калгасаў, зрыў адкормачных апэрацый.

Прычына тая, што Белкаапсаюз дагэтуль не прапанаваў сваёй нізоўцы зьняць жывёлу з кантрактацыі, ня гледзячы на дырэктывы аб прыступленьні да гэтай работы з 1-га ліпеня.

Трэба каму належыць зацікавіцца такой недапушчальнай злачынна-безадказнай работай.

Трэба прыняць тэрміновыя меры, каб паскорыць выкананьне пляну загатовак і зьняцьце з кантрактацыі.

Дырэктыва партыі аб 100-процантным выкананьні пляну загатовак у ліпені павінна быць бязумоўна выкавана.

І. К.

Менск у рыштаваньнях

На пленуме жыльлёва-будаўнічай сэкцыі Менгарсавету

24-га ліпеня адбыўся пленум жыльлёва-будаўнічай сэкцыі Менгарсавету. Пленум заслухаў даклады Белдзяржбуду, Белжылсаюзу і Менбуду аб стане будаўніцтва гор. Менску.

Будаўніцтва гэтага году характарызуецца навучаньнямі разьмерамі і тэмпамі. Як адзначалі дакладчыкі і члены гарсавету, Менск ніколі яшчэ не перажываў такога размаху будаўніцтва. Побач з пабудовай буйных жыльлёвых дамоў на 112 і 76 кватэр і інш., будуюцца Дом Ураду, цэнтральны інстытут працы, санітарна-гігіенічны інстытут, сьвіназводная і расьліназводная станцыі, клініка, політэхнікум, бібліятэка, дом дзяржбанку, інтэрнат для студэнтаў і многа другіх урадавых і грамадзкіх будынкаў. Закончана пабудова стадыёну, трамвайнага парку, амбуляторыі, складу Хлебасаюзу і цагельняў.

Заслугоўваюць грамадзкай увагі і недахопы ў будаўніцтве, якія рэзка крытыкаваліся членамі гарсавету і прадстаўнікамі жактаў. Так, напрыклад, **БЕЛЖЫЛСАЮЗ ЗАМЕСТ НЕПАСРЭДНАГА КІРАЎНІЦТВА ЖЫЛЬЛЁВЫМ БУДАЎНІЦТВАМ ЖАКТАЎ І ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ ЖАКТАМ, прымае падрады на пабудовы, не зьвязаныя з яго непасрэднай дзейнасьцю — пабудова стадыёну, розных навучальных устаноў і г. д., а на работу жактаў не зварачае ўвагі. У жакце № 19 прадстаўнік тэхнічнага нагляду Белжылсаюзу за апошнія 3 гады ня быў ні аднаго разу. Увесь свой будаўнічы матар'ял Белжылсаюз выдаў на пабудову стадыёну, а жакты з-за недахопу будаўнічых матар'ялаў ня могуць выканаць свайго будаўнічага пляну.**

На будаўніцтве не хапае да 400 чорнарабочых, да 50 арматуршчыкаў, не дастае сталяроў і іншых кваліфікаваных рабочых. Гэта тлумачыцца вялікім попытам на рабочую сілу і перакваліфікацыі значнага ліку чорнарабочых гор. Менску. Біржа працы своячасова не падрыхтавалася для вярбоўкі рабочых з раёнаў БССР.

Таксама адчуваецца недахват транспарту, не арганізаванасьць яго і дарагавізна. Адсутнасьць транспарту затрымлівае работу, на станцыі сабралася некалькі сот вагонаў з будаўнічымі матар'ялами.

Пленум сэкцыі, зьвярнуўшы вялікую ўвагу на пытаньне, тэмпу будаўніцтва, далейшае абмеркаваньне яго перанёс на наступнае пасяджэньне, якое адбудзецца ў першых чыслах жніўня.

Г.

СУД

Кулакі-тэрарыстыя жорстка пакараны

Вынясная сэсія Менскага акруговага суду ў мястэчку Астрашыцкі Гарадок разглядала справу аб нападзе кулакоў на калгасьнікаў на хутары Зуеўка, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну.

У лютым 1929 году ў вёсцы Баяра, паводле ініцыятывы бедняка-актывіста Скавенскага, быў арганізаваны калгас «Працаўнік» з 7-мі гаспадарак, які зараз пашырыўся да 46-ці гаспадарак. Калгас пашырыў сельска-гаспадарчую плошчу, павысіў ураджайнасьць палёў, увёў новыя машыны і паогул паказаў добры прыклад культурнага вядзеньня калектыўнае гаспадаркі.

Гэта не падабалася мясцовым кулакам з хутара Зуеўкі.

24-га мая, калі каморнік Пісарэнка і актывісты Скавенскі і інш. калгасьнікі абыходзілі межы калгасу, кулакі, на чале несьвядомай часткі жанчын і падкулачнікаў, напалі на каморніка, паламалі інструманты і спынілі зямляўпарадкаваўчую работу.

31 мая, калі каморнік Пісарэнка і калгасьнік Скавенскі, абмяралі зямлю хутароў, на іх зноў напалі мясцовыя кулакі і зьбілі Скавенскага да поўсьмерці.

Вынясная сэсія прыгаварыла кулака **Алеся Пілецкага** да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—расстрэлу, але ўлічваючы моц Савецкага Саюзу і старасьць Пілецкага, замяніла расстрэл 10 гадамі зьняволеньня ў **ізаляцыйных лягерах**, з высылкай за межы БССР на пяць год.

Антось Пілецкі прыгавораны **на 8 год**, Мікола Макейчык і Уладзімер Паляшук на 6 год зьняволеньня, іншыя — на 2-3 гады зьняволеньня.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

У Віцебскі Дзяржаўны каапэрацыйны тэхнікум на 1930-31 навучальны год.

1) Каапэрацыйны тэхнікум рыхтуе працаўнікоў каапэрацыйных сыстэм: інструктароў, бухгальтароў, пляніравікоў-статыстыкаў і г. д.

2) У тэхнікуме ёсьць тры аддзяленьні: сельска-гаспадарчай каапэрацыі, спажывецкай каапэрацыі і аддзяленьне таваразнаўчае. Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме 3 гады. Пры пераходзе на другі курс праводзіцца разьбіўка студэнтаў на спэцыяльнасьці. На працягу ўсяго тэрміну навучаньня студэнты адбываюць практыку. Па сканчэньні тэхнікуму студэнты накіроўваюцца на практычную працу ў каапэрацыйныя сыстэмы.

3) Прыём студэнтаў на 1-шы курс, а таксама на падрыхтоўчы курс, будзе праводзіцца з 15 жніўня па 1 верасьня 1930 г. Прымацца будуць, як па камандыроўках каапэрацыйных саюзаў, таксама і без камандыровак. Перавага будзе аддавацца камандыраваным. На падрыхтоўчы курс прымаюцца выключна рабочыя, батракі, беднякі і калгасьнікі з ведамі 4—5 груп 7-годкі.

4) Скончыўшыя ў 1927—28, 28—29 і 29—30 г. г. 7-годку, школу узьвышанага тыпу прымаюцца бяз іспытаў.

5) Асобы з практычным каапэрацыйным стажам могуць быць прыняты з ведамі да 6 груп 7-годкі. Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 17—18 год.

6) Іспыты праводзяцца з 15 да 25 жніўня па наступных прадметах: матэматыка, грамадзнаўства, прыродазнаўства, фізыка і беларуская мова.

7) Прыём заяў з 10 ліпеня па 15 жніўня 1930 г. Для заяў абавязкова павінны быць далучаны наступныя дакументы: а) аб узросьце (мэтрыка), б) аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын), в) аб асьвеце, г) дзьве фатаграфічныя карткі, д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя, е) даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі, ж) даведка аб тым, што не пазбаўлены выбарчых правоў, з) для сялян акладны ліст, або засьведчаная копія з яго па с.-г. падатку на 1929—30 г., а для саматужнікаў адпаведны дакумант аб падатку на 1929—30 г., і) анкета, засьведчаная прафэсыянальнымі або савецкімі арганізацыямі.

Да заявы неабходна прылажыць паштовыя маркі на 40 кап. для адказу, выклику і адсылкі дакумантаў у выпадку незалічэньня.

Для падаўшых заявы на падрыхтоўчы курс будуць праводзіцца іспыты пасьля пастановы мандатнай камісіі, прычым кожны паасобку атрымае аб гэтым асабістае паведамленьне (кожны павінен даслаць у тэхнікум свой дакладны адрас).

Дакумэнты трэба прадстаўляць толькі ў арыгіналах.

Асобы, якія жадаюць паступіць у Віцебскі Дзяржаўны Каапэрацыйны Тэхнікум падаюць заявы з усімі дакумантамі на імя прыймовай камісіі тэхнікуму — г. Віцебск, вул. Талстога, № 3.

Дырэктар тэхнікуму **ЛАМДЭН**

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Сёньня

— **Фота выстаўка.** А 8 гадз. веч. у залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца зачыненьне ўсебеларускай фота-выстаўкі. Запрашаюцца ўсе фота-гурткі і асобныя фота-аматары—члены саюзу. У парадку дня: вынікі выстаўкі і раздача ўзнагарод.

— **Дом Асьветы** наладжае вялікую экскурсію асьветнікаў з падшэфнай чырвонаармейскай часткай за горад у Дразды. Увесь час іграе духавы аркэстр, будзе працаваць буфэт і буфэтніцы, паказаны дасягненьні і масавая гульня. Збор у садзе асьветы а 9 гадз. раніцы.

— **Кастрыч. РК МОПР'у.** А 7 г. веч. адбудзецца нарада жансэкцый жактаўскіх ячэек МОПР'у і актыву.

— **Дом Асьветы.** А 7 г. веч. адкрыты сход парткалектыву працасьветы. У парадку дня: вынікі XVI зьезду УсеКП(б). Запрашаюцца асьветнікі.

— **Кастрыч. РК КП(б)Б.** А 7 г. веч. у памяшк. РК склікаецца нарада кіраўнікоў сэктараў пры РК КП(б)Б. На нараду павінны зьявіцца наступныя т. т.: Мінц (РК), Абрамовіч (ячэйка «Энэргія»), Бягун (ячэйка Калгасцэнтру), Мядзьведзяў (Банк установы), Паўловіч (ФЗУ), Душацкі (яч. «Бальшавік»). Яўка без спазненьня.

Заўтра

— **Кастрыч. РК КП(б)Б.** А 6 г. веч. у клюбе Леніна (ст. Менск, пасаж.) Кастрыч. РК КП(б)Б склікае **раённы сход работніц і жонак рабочых** з парадкам дня:

1. **Аб становішчы рабочага забесьпячэньня.**
2. **Аб далейшых задачах работы сярод жанчын.**

Ячэйкам правесьці падрыхтоўчую працу па правядзеньні гэтага сходу.

Ад аб'яднанага бюро скаргаў НК РСІ. А 7 г. веч. у памяшк. НК РСІ (Савецкая, 55) склікаецца пашыраная нарада рабочых—засядацеляй пры аб'яднаным бюро скаргаў НК РСІ і Мен. АК РСІ, у сувязі з няяўкай большай часткі рабочых - засядацеляй на нараду 20/VII і няяўкі зусім з наступных прадпрыемстваў: гарбарні «Бальшавік», «Энэргія», гута «Пралетары», дражджж. зав. «Пралетары», ф-кі «Кастрычнік», друкарні «Зьвязда», зав. «Беларусь», абутковай ф-кі, зав. «Чырвоная Зара», п/к. тэстыльшчыкаў, шчаціннай ф-кі, ф-кі «Адраджэньня», цукернай ф-кі і лямцавай. Яўка ўсіх засядацеляй абавязкова ў сувязі з асаблівай важнасьцю пытаньняў.

Просьбе яч. КП(б)Б і ФЗМК, у выпадку занятасьці гэтых т. т. на грамадзкай працы, вызваліць іх у гэты дзень.

Пасьлязўтра

— **Фрунз. РК КП(б)Б.** У панядзелак 28 ліпеня, а 7 г. веч. у памяшк. АК МОПР/у (Савецкая, 87) склікаецца пашыранае пасяджэньне актыву МОПР'у Фрунз. раёну. Запрашаюцца члены бюро ячэек, рэв. камісій, зборшчыкі членскіх узносаў і ўсе актывісты МОПР'у.

У парадку дня:

1. **Аб перавыбарчай кампаніі мопраўскіх ячэек.**
2. **Аб рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за 4 гады».**
3. **Аб паходзе за збор паперы.**

— **Партсьледчы ЦКК КП(б)Б** просіць ня выяжджаючых у Менск, паведаміць свае адрасы т. т. **Хавіна А.** і **Макрыцкага** Т. С., таксама сакратароў ячэек, дзе яны лічацца на вучоце.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ
2-гі ТЫДЗЕНЬ
Кіно-тэатр „Культура"
ДАЧКА ГІЛЯНА
драма ў 8 частках
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
апошнае дасягненьне тэхнікі жывога кінематографа
ЦУДОЎНЫЯ ЦЕНЫ
Дзеля ўсьпрыняцьця эфэкту кожны глядач атрымоўвае спэцыяльныя акуляры ў касе кіно (па сабекошту) 7 к. за штуку.
Пачатак сэансаў: 7 гадз., 9 гадз., 10 г. 30 м.
КІНО Інтэрнацыянал
СЁНЬНЯ І ШТОДНЯ
нямецкі фільм
ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ (КРЫЦАПРЫСЯГА)
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.
Касе адкрыта з 5 г. 30 м.
КІНО Пралетары
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
ЧАЛАВЕК АГНЮ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г.
Каса адкрыта з 5 г.
КІНО-САД
Лепшая навінка сэзону
ЛЯЛЬКА з МІЛЬЕНАМІ
Пачатак 1-га сэансу а 10 гадз.
Каса адкрыта з 6 гадз. 30 м.

КІНО „СПАРТАК"
АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК
ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА
гістарычны кіно-фільм у 8 част.
У галоўнай ролі ПОЛІ НЭГРЫ
Пачатак сэансаў:
1-га сэансу а 7 г.,
2-га сэансу а 9 г.,
3-га сэансу а 10 г. 45 м.
КАСА—ад 6 гадз.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
ВЫШЛІ з ДРУКУ
і прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі:
КОГАН І. і ТРАЯНОЎСКІ А.—Вайсковыя паўстаньні ў 1906-1907 г.
54 стар. Цана 20 к.
ЛЬВОЎ-МАРСІЯНІН П.—Прэсьня. (Аповесьць)
206 стар. Цана 65 к.
ЗВОНАК АЛЕСЬ.—Каршун. (Поэма).
30 стар. Цана 35 к.
ЗНАЁМЫ С.—Дом № 31. (Вытворча-бытавыя нарысы).
65 стар. Цана 22 к.

КЛІМАВІЦКАЯ АБ'ЯДНАНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА
абвяшчае, што прыём заяў у школу на абодвы цэхі праводзіцца да 1 жніўня. Прыём выключна з адукацыяй за 7-гадовую працоўную школу.
Заявы з належнымі дакумантамі і заверанай анкетай накіроўваюцца па адрасе:
Клімавічы, Магілеўскай акр., прыймовай камісіі прафтэхшколы

ПОЛАЦКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА
АГНЯТРЫВАЛАГА БУДАЎНІЦТВА
абвяшчае ПРЫЁМ на першы курс
Школа рыхтуе высокакваліфікаваных рабочых, дзесятнікаў і тэхнікаў па агнятрывалым будаўніцтве. Тэрмін навучаньня 2 гады. За гэты час слухачы школы праходзяць наступныя прадметы ў аб'ёме сярэдняй навучальнай установы:
1. Тэхнічная матэматыка і фізыка.
2. Хэмія, механіка і матэрыязнаўства.
3. Будаўнічае мастацтва і агнятрывалае будаўніцтва
4. Тэхналёгія і грубая кераміка.
5. Графіка. Вурочнае пералажэньне.
6. Нямецкая мова.
7. Беларуская мова і літаратура.
8. Грамадазнаўства: а) гіст. клясавай барацьбы ў сувязі з гіст. УсеКП(б); б) палітэканомія і эканомпалітыка; в) асноўныя пытаньні марксызму і ленінізму.
Школа на 1930-31 нав. год прымае 80 чалавек
УМОВЫ ПРЫЁМУ
У школу прымаюцца асобы ўзростам ад 15 год, скончыўшыя поўны курс 7-хгадав. школы, альбо маючыя агульна-адукацыйную падрыхтоўку ў гэтым-жа аб'ёме. Таварышы скончыўшыя 7-дзі, ШСМ, прафшколы на базе 4-х годкі і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы і агнятрывалую школу, прымаюцца бяз іспытаў незалежна ад часу скончэньня.
Прыём заяў з 20 ліпеня па 20-е жніўня г. г.
Заявы падаюцца на імя прыймовай камісіі пры школе з наступнымі дакумантамі: 1) дакумант аб узросьце (мэтрыка); 2) аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын); 3) аб асьвеце; 4) 2 засьведчаныя фатаграфічныя карткі; 5) мэдычнае пасьведчаньне; 6) дакумант аб матар'яльным і сацыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў да і пасьля рэвалюцыі; 7) даведка аб карыстаньні правам выбарчага голасу; 8) для сялян акладны ліст на 29-30 год, а для саматужнікаў патэнт; 9) анкету засьведчаную прафэсыянальнымі, або савецкімі арганізацыямі; 10) паштовых марак на 20 кап.
ТЭРМІН ІСПЫТАЎ І ЗАЛІЧЭНЬНЯ з 20-га па 25 жніўня. Аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы падаўшыя заявы. Стыпендый і інтэрнатам будуць забясьпечаны 70-80 проц. слухачоў. Пачатак заняткаў 1 настрычніка.
Адрас канцылярыі: г. ПОЛАЦАК, Ленінская 48.
ПРАФШКОЛА.

Макаронная фабрыцы імя Леніна ў г. Нова-Барысаве
патрабуюцца на сталую працу 1) інжынэр-мэханік або тэхнік-мэханік, 2) цаплотэхнік.
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

АД УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКУ
АБ'ЯВА.
На падставе пастановы праўленьня Дзяржбанку даводзіцца да ведама ўсей кліентуры канторы і філіялаў Дзяржбанку па БССР, што
ПАЧЫНАЮЧЫ з 1-га ЖНІЎНЯ г. г.
А) Рахункі на суму ніжэй 50 руб. банкам прымацца ня будуць.
УВАГА: У тых выпадках, калі за працягу месяцу на рахунку пастаўшчыка ня накопіцца сума ў 50 руб., тады дазваляецца прыняць рахунки і на меншыя сумы, але ня ніжэй 25 руб.
Б) Рахункі на суму ад 51 да 500 руб. павінны аплачвацца кліентурай разьліковымі чэкамі без прадстаўленьня рахункаў у банк, але з паказаньнем у чэках: „Разьлік за тавары".
УСЕБЕЛАРУСКАЯ К-РА ДЗЯРЖБАНКУ.

КІРАЎНІЦТВАМ АШЧАДКАСАМІ БССР
— арганізуюцца —
4-х МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ БУХГАЛЬТАРОЎ
ДЛЯ РАЁННЫХ АШЧАДКАС.
Курсы мяркуецца адкрыць 15 жніўня.
На курсы прымаюцца рахункаводы, п-бухгальтары, якія маюць на менш гадавога стажу працы ў гэтай галіне.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 90 руб. у месяц і інтэрнатам або кватэрнымі грашыма ў суме 10 р. у м-ц.
Падрабязныя ўмовы прыёму можна атрымаць у акруговых ашчадкасах. Прыём на курсы праводзіцца акруговымі ашчадкасамі, куды і належыць зьвяртацца.
Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.

У кнігарнях
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА І СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ
прадаюцца новыя кнігі
АНДРЭЯ АЛЕКСАНДРОВІЧА
1. Пазма імя Вызваленьня.—Цана 30 кап.
2. Устаноўка (зборн. вершаў). — Цана 30 кап.
3. Гудкі (зборн. вершаў).— Цана 20 кап.

ТЭРМІНОВА
патрабуюцца мэдыцынскія працаўнікі для Біра-Біджана:
Доктар—загадчык больніцай—пэнсія 300 р.
Зубны доктар, фэльдчарыцы, акушоркі—пэнсія да 200 р.
Прапановы з дакумантамі накіроўваць у Белазет, Менск, Савецкая, 70.
Асабістыя даведкі ў д-ра Дзіхцяра (Інстытут Аховы Працы, тэл. № 12-93, рог К. Маркса і Энгельса № 44-23).

У МЭТАХ УКАМПЛЕКТАВАНЬНЯ АШЧАДНАГА АПАРАТУ КВАЛІФІКАВАНЫМІ ПРАЦАЎНІКАМІ,
ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ЗАВОЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫХ НАВУК
АРГАНІЗАВАНА
ЗАВОЧНАЯ ГРУПА ПА АШЧАДНАЙ СПРАВЕ
Тэрмін навучаньня 12 месяцаў.
Кошт навучаньня на курсах 39 руб. 50 кап.
Кошт ільготнага месца 14 руб. 50 кап.
Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне і маюць пераважныя права на заняцьце кваліфікаванай працы ў ашчадным апараце.
Заявы на курсы накіроўваюцца праз акруговыя ашчадкасы. Праспэкт курсаў можна атрымаць дармова ў ашчадкасах.
КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР.

ДА АСЕНЬНЯГА ПРЫЕМУ Ў ВТНУ
БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ
рэарганізуэмы, згодна пастановы СНК БССР у 4 самастойныя інстытуты: ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНЫ, БУДАЎНІЧЫ, МЭХАНІЧНЫ і ЭЛЕКТРАТЭХНІЧНЫ
— ПАВЕДАМЛЯЕ, —
што прыём заяў на ўсе 4 факультэты працягнут да 1-га жніўня г. г.
Не пазьней 1-га жніўня ўсе курсы па падрыхтоўцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны прадставіць сьпісы з дакумантамі слухачоў, якія накіроўваюцца ў палітэхнічны інстытут, згодна разьвёрстцы, Народным Камісарыятам Асьветы.
Курсы, якія не прадставяць гэтых сьпісаў, мэханічна выключаюцца з агульнага кантынгенту прыёму ў палітэхнічны інстытут.
Аб дні пачатку прыёму іспытаў будзе паведамлена дадатково.
БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК
у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,
атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА"
па месцы знаходжаньня ў водпуску,
паведаміўшы ў аддзел падпіскі газ. «ЗЬВЯЗДА»
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Газета будзе дасылацца па новым адрасе
без асобнай даплаты.

УВАГА!
З 20 ліпеня АДКРЫТЫ
фатаграфіі Белдзяржкіно,
Савецкая, 73 і Савецкая, 81.
— У фат